Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 КАСТРЫЧНІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 212 (29326)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ Ў АДНЫМ ЯБЛЫКУ 5

ШТО БУДЗЕМ НАСІЦЬ ГЭТАЙ ЗІМОЙ 19

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КУНЦЭВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Радыкалізацыя вулічных акцый і непрыкрыты экстрэмізм асобных іх удзельнікаў не толькі выкрываюць сапраўдны твар пратэсту, але і спрыяюць кансалідацыі беларускага грамадства вакол улады. Людзі стаміліся ад бессэнсоўных бадзянняў пратэстоўцаў па горадзе, што немінуча прыводзіць да збою ў рабоце грамадскага транспарту і камунальных службаў, псавання элементаў гарадской інфраструктуры і асабістай маёмасці гараджан. Яны хочуць парадку і спакою на мінскіх вуліцах. Адсюль і ўзрастаючая падтрымка дзеянняў сілавікоў, і павышаная актыўнасць канструктыўных ініцыятыў грамадзян. Людзі ўбачылі, што ад вулічнага флэшмобу да штурму РАУС усяго адзін крок, а на змену кветачкам і стужачкам прыйшлі камяні і «кактэйлі Молатава». Многія зразумелі, што мір і бяспека ў краіне — гэта агульная задача і ўлады, і грамадства».

КАРАТКА

• Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне «Аб падрыхтоўцы шостага Усебеларускага народнага сходу». У адпаведнасці з дакументам створаны Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні сходу. Аргкамітэт узначаліць прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка.

• **БРСМ аднавіў работу гарачых ліній для аказання дапамогі пажылым грамадзянам.**

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Гэта мае функцыі і паўнамоцтвы — абараніць спакой і мір нашых грамадзян»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў шэраг важных кадравых рашэнняў і выказаўся пра абстаноўку ўнутры краіны і побач з яе межамі



Фота БелТА.

Міністрам унутраных спраў Беларусі прызначаны Іван Кубракоў, які да гэтага ўзначальваў сталічную міліцыю. Юрый Караеў, які ўзначальваў МУС, стаў памочнікам Прэзідэнта Беларусі — інспектарам па Гродзенскай вобласці, на такую ж пасаду па Брэстчыне накіраваны Валерый Вакульчык, які з верасня гэтага года працаваў дзяржаўным сакратаром Савета бяспекі Беларусі, а да гэтага быў старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Памочнікам Прэзідэнта Беларусі — інспектарам па горадзе Мінску стаў Аляксандр Барсукоў (займаў пасаду намесніка міністра ўнутраных спраў).

Кажучы пра падставы для прызначэння Кубракова міністрам, Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў, што ў ведамстве з'явілася дастатковая кандыдатур на кіруючыя пасады.

СТАР. 2

Лёс салдата. Музей і памяць

У Рагачове на базе раённага цэнтра турызму і краязнаўства дзейнічае музей «Лёс салдата», які прысвечаны падзеям вайны на Рагачоўшчыне і ўдзельнікам вызвалення горада над Дняпром. Дваццаць гадоў музеем на грамадскіх пачатках кіруе вядомы ў раёне краязнавец Генадзь ЦІТОВІЧ *(на фота злева)*, ён па-ранейшаму дапаўняе музейную экспазіцыю рэдкімі экспанатамі: знаходкамі шматгадовых пошукавых работ, якімі займаліся навучэнцы Гомельскага ПТВ № 56, на мясцінах цяжкіх баёў і гераічнай абароны. Шмат гадоў Генадзь Васілевіч збірае інфармацыю і ілюстрацыі, у тым ліку фатаграфіі, пра землякоў-ветэранаў — франтавікоў, партызанаў, удзельнікаў супраціўлення нямецкаму акупацыйнаму рэжыму. Нядаўна мясцовы рагачоўскі мастак і паэт Міхаіл Міронаў перадаў музею фота свайго бацькі-франтавіка Пятра Міронава, які ў лютым 1944 года ў складзе 120-й стралковай дывізіі Першага Беларускага фронту ўдзельнічаў у Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі, вызваляў Рагачоў, а потым прыняў удзел у наступальнай аперацыі «Баграціён» і дайшоў да Берліна.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Разумныя грошы

Фінансістам патрэбны банкноты — прымаюць любыя

Банкі гарантуюць, што захаваюць нашы грошы

Фінансавыя паслугі адзін аднаму людзі аказваюць ужо тысячы гадоў. Яны давалі пазыку, дапамагалі зберагаць, абменьвалі адну ўмоўную валюту на іншую. Але паколькі ўсе гэтыя дзеянні спалучаныя з пэўнымі рызыкамі, то браць іх на сябе проста так хоча мала хто. У пачатку 1400-х гадоў пачалі з'яўляцца фінансавыя арганізацыі з функцыямі банкаў, якія гарантавалі захаванасць грошай і ў той жа час маглі даваць у доўг немалыя сумы. Дарэчы, самы стары з дзеючых банкаў створаны ў Італіі ў 1472 годзе.

Ёсць рэзерв — на ўсякі выпадак

Перавага банка заключаецца ў магчымасці ацэньваць і дыверсіфікаваць рызыкі. Працэнты, якія ён прапануе па ўкладах, будуць перавышаць інфляцыю, ды і спосаб захоўвання там больш надзейны, чым дома або на прадпрыемстве. Акрамя таго, аддаючы грошы ў банк, чалавек атрымлівае гарантыю вяртання сваіх сродкаў. Заканадаўства патрабуе, каб банкі захоўвалі пэўны працэнт сваіх грошай у рэзерве на выпадак, калі крытычная маса ўкладчыкаў раптам вырашыць у адно імгненне забраць свае зберажэнні.

У неспакойны час (як цяпер) банкі, каб прыцягнуць грошы насельніцтва, прапануюць завышаныя стаўкі па дэпазітах, або іншыя «салодкія плюшкі» (акцыі) для сваіх кліентаў.

СТАР. 3

«...абараніць спакой і мір нашых грамадзян»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Раней вельмі вялікая праблема была ў мяне на высокія пасады, нават не на генеральскія... Ну проста цяжка было знайсці. ***Падраслі маладыя хлопцы, сапраўдныя патрыёты»,*** — сказаў ён.

На выбар кандыдатуры паўплывала і тое, што, па словах кіраўніка дзяржавы, зараз у Мінску досыць складаная сітуацыя, а Кубракоў, з аднаго боку ёю добра валодае, з другога — не будзе перашкаджаць новаму начальніку ГУУС Мінгарвыканкама, бо сам толькі што быў на яго месцы.

«Задума ў мяне такая была — стварыць сплаў вопыту, адданасці, патрыятызму, таленту. І я вельмі спадзяюся, што ў вас гэтая работа атрымаецца, — звярнуўся ён да новага міністра. — Тым больш, што мне двух аксакалаў — і Караева, і Вакульчыка — прыйшлося адправіць на заходні напрамак, каб яны там арганізавалі вялізную работу ў гэтых абласцях».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што мэта такой ратацыі — навядзенне парадку ў названых абласцях і Мінску.

«Трэба заўсёды быць праўдзівым, надзейным для суседа»

«Мяркую, што парадак у Мінску мы навядзём, гэта не пытанне. Не тая сітуацыя. Хоць мы не ведаем, што яны яшчэ нам з Польшчы падкінуць. Але, бачыш, Бог ёсць на свеце. ***Яны хацелі ў нас рэвалюцыю наладзіць, нават не рэвалюцыю, а мяцеж, а атрымалі самі,*** — заўважыў Прэзідэнт. — Сітуацыя няпростая, і яна проста так не вылезе. Там не адмарозкі падняліся. Там падняліся жанчыны, і зразумела, за што падняліся. Там падняліся сяляне, і яны ведаюць, за што. Там працоўныя падняліся — ведаюць за што. Там дзяржслужачыя».

На думку кіраўніка дзяржавы, тэмы забароны абортаў і абмежавання ў вырошчванні пушных звяроў сталі толькі спускавым кручком для пратэстаў у Польшчы, а сапраўдная прычына — фальсіфікацыя вынікаў сёлетніх прэзідэнцкіх выбараў у гэтай краіне.

«Дуда перамог у Польшчы праз фальсіфікацыю выбараў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Там нават працэнта перавагі не было. Сфальсіфікаваў, і адтуль усё пачалося. І яны хацелі стрэлкі перавесці на нас. А палякі не дурныя. Ну і куча праблем эканамічных, і сацыяльная праблема галоўная. Багатыя, багатыя... Так, там ёсць купка багатых, але колькі там бедных! ***І разрыў паміж беднатой і багатымі вялізны. Гэта самае небяспечнае для любой дзяржавы»***.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што і для Літвы падобнае ўмяшанне ва ўнутраныя справы Беларусі прывяло да перамогі там апазіцыі на парламенцкіх выбарах.

«А што ва Украіне адбылося? Наш сябар Валодзя Зяленскі — знішчальнае паражэнне адбылося на выбарах у мясцовае самакіраванне, — працягнуў ён. — ***Таму не трэба ў суседа кідаць камяні. Не трэба ў наш агарод лезці. Разбярыцеся ў сябе. Трэба заўсёды быць праўдзівым, надзейным для суседа.*** Адданым сваёй краіне і шчырым».

Паўнамоцтвы памочнікаў будуць пашыраныя

Адносна прызначэння Валерыя Вакульчыка і Юрыя Караева памочнікамі ў заходняя рэгіёны, кіраўнік дзяржавы заявіў: «Публічна хачу давесці да ўсіх прысутных: мною прынята кадравае рашэнне, і вы накіроўваецеся на не тое што асабліва небяспечныя ўчасткі, але вельмі адказныя ўчасткі нашай краіны, у сувязі з тымі падзеямі, перш за ўсё, якія адбыліся (яны яшчэ не скончаны, мы яшчэ не ведаем, у што гэта можа вылівацца). Чаму вы? Вы людзі ваенныя, дасведчаныя, вас не трэба вучыць».

Прэзідэнт распарадзіўся ўдасканаліць нарматыўную прававую базу з тым, каб пашырыць паўнамоцтвы яго памочнікаў у рэгіёнах.

«Я не хачу цяпер канкрэтызаваць іх (паўнамоцтвы памочнікаў. — **«Зв.»**) экспромтам. Мы пра гэта яшчэ павінны пагаварыць. Але традыцыйна застаюцца «кадры» на гэтых напрамках — падбор іх, натуральна, разам з губернатарам. І кантроль за дзейнасцю кадраў. Цалкам. Усіх кадраў у вобласці. Кантроль, бо ***памочнік — ён інспектар, той, хто правярае работу кадраў ад старшыні сельскага Савета, кіраўніка прадпрыемства да губернатара,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але па падборы і іншых пытаннях, сацыяльна-эканамічнага развіцця, вядома, гэта вельмі тонкая работа. У іх вопыт ёсць. Гэта праца з кіраўнікамі рэгіёнаў — Брэсцкай вобласці, Гродзенскай вобласці і Мінска. Таму кантакт з губернатарам — гэта вельмі тонкая работа, і я абсалютна перакананы, што, маючы такі досвед, яны гэта змогуць зрабіць».

Ён таксама заявіў пра неабходнасць стварэння сістэмы працы памочнікаў з Прэзідэнтам: бягучая дзейнасць павінна каардынавацца з кіраўніком яго Адміністрацыі, як гэта было дагэтуль, разам з тым з пэўнай перыядычнасцю павінны адбывацца асабістыя даклады кіраўніку дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў сваё кадравае рашэнне тым, што на пасады яго памочнікаў у названых рэгіёнах спатрэбіліся ***«адданыя, надзейныя людзі, якія адначасова з'яўляюцца высокімі прафесіяналамі»***. І прадыктавана гэта пэўнымі, на яго думку, пагрозамі нацыянальнай бяспецы.

«Давайце шчыра: у Гродне вывешвалі польскія сцягі. Ну, калі іх сёння знялі, гэта ж не значыць, што там у кагосьці ў галаве штосьці не блукае. Вы бачыце павадзіны некаторых клірыкаў нашых цэркваў — і каталіцкай, і праваслаўнай. Таму гэта таксама зона вашай адказнасці, — сказаў ён. — І наогул вы павінны разумець, што за межамі нашай краіны натаўцы не ўціхамірыліся, што б яны ні казалі».

Аляксандр Лукашэнка згадаў пра сваю нядаўнюю тэлефонную размову з дзяржсакратаром ЗША Майклам Пампеа.

«У нас з ім вельмі добрыя адносіны. Усё, што пішуць у тэлеграм-каналах, — гэта фігня. Нічога ён ад мяне не патрабаваў, была вельмі цёплая, добрая такая размова. Але я яму проста сказаў, па-сяброўску: «Майкл, нягледзячы на гэта, я ж разумею, што адбываецца». І я яго папярэдзіў: калі толькі там тузануць з боку Польшчы, Літвы і, можа, Украіны (гэта нават не абмяркоўваецца, ім не да гэтага), а вось палякі і літоўцы, у асноўным палякі (што там літоўцы — арміі няма), — ну, мы будзем адказваць», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў, што дзяржсакратар ЗША яго запэўніў: названай пагрозы няма і не будзе. «Я кажу: добра, я пачуў. Мы гэта чуем, але мы павінны рэагаваць. Я пакуль пра Мінск не кажу, я кажу пра гэтыя заходнія вобласці», — заўважыў беларускі лідар.

Прэзідэнт растлумачыў, што ваенныя людзі на пасадзе яго памочнікаў спатрэбіліся таксама дзеля ўзмацнення бяспекі на заходняй мяжы.

«Я не хачу публічна казаць пра тое, якія мерапрыемствы мы праводзім і будзем праводзіць на мяжы. І мне патрэбныя там ваенныя людзі. Вядома, Валерыю Паўлавічу (Вакульчыку. — **«Зв.»**) прасцей, таму што ён у свой час займаўся мяжой. Я думаю, што з Юрыем Хаджымуратавічам (Караевым. — **«Зв.»**) яны падзеляцца вопытам. У гэтага вопыт большы ў бяспецы і навядзенні парадку. У Валерыя Паўлавіча больш тонкая была работа. У іх ёсць агульная мова. Яны разам працаваліся, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Нам трэба сёння яшчэ раз паглядзець, мы шмат зрабілі, калі я казаў: мы павінны закрыць мяжу. Закрыць мяжу — не зрабіць яе жалезнай заслонай, гэта нікому не трэба... Мяжа — гэта зона дружбы народаў. Вы бачыце, нам кінулі выклік. Якая тут дружба... Але народы невінаватыя».

Разам з тым памежнай тэматыцы аддаецца асабліва ўвага і ў сувязі з распаўсюджваннем каранавіруса ў свеце: «Вы бачыце, якая ўспышка шалёнай адбылася ў разы ў Еўропе. Ды і ў нас ужо рост пад тысячу (выяўленыя выпадкі захворвання ў выніку тэсціравання. — **«Зв.»**). Дзякуй богу, няма шалёнага росту «ковіда»-пнеўманій».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што для барацьбы з інфекцыяй у Беларусі ёсць усё неабходнае, уключаючы апараты ШВЛ. Разам з тым расслабляцца нельга, лічыць ён.

«Мы заўсёды былі надзейнай заслонай для палякаў, літоўцаў, латышоў і нават украінцаў на мяжы. Мы не прапускалі нікога, нічога. Што ім яшчэ трэба ад нас?» — абурыўся Прэзідэнт.

«У вас ёсць свой начальнік — Прэзідэнт»

Стабільнасць у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях з'яўляецца зараз надзвычай важнай задачай, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Нельга супакойвацца і з нагоды вось гэтых мэт, што ім, палякам, патрэбна ўся Беларусь. Вы ведаеце, нават калі ўсё НАТА ўвойдзе ў Беларусь, у іх гэта не атрымаецца. Нават калі мы адны будзем, у іх гэта не атрымаецца. Мы за сваю краіну загінем усе. Не дай бог, вядома. Яны павінны гэта ведаць», — рэзюмаваў беларускі лідар.

Не трэба супакойвацца, на думку Прэзідэнта, і адносна таго, што пратэсныя акцыі ў асноўным адбываюцца ў Мінску. І гэта таксама сфера адказнасці, у тым ліку і яго рэгіянальных памочнікаў.

«Няхай невялікія там былі гэтыя акцыі — адна-дзве тысячы, але тым не менш. Асабліва ў Гродне. Гэта што такое — заклікаюць спыніць «Гродна Азот» ці наладзіць забастоўку? А калі выбух? Там жа высокатэхналагічная небяспечная вытворчасць. Не дай бог што здарыцца — Гродна побач, накрые цалкам. А ружа вятроў заходняя. Там круціць вецер, над Гроднам разнясе воблака, загінуць тысячы і тысячы людзей. Таму пытанне грамадскай бяспекі — найважнейшае пытанне», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што ў кампетэнцыю памочнікаў, у прыватнасці Валерыя Вакульчыка ў Брэсцкай вобласці і Юрыя Караева ў Гродзенскай, будзе ўваходзіць вайсковы складнік: «Дэсантна-штурмавая брыгада ў Брэсце на гэта арыентавана па законе. І вялізная мотастралковая брыгада разгорнута ў Гродне. Гэта апора ваша і сілавікоў, губернатараў. Сілавы складнік. Я гэта адкрыта кажу і не хаваю. Усе павінны гэта разумець».

Прэзідэнт таксама паставіў задачу па ўзаемадзеянні памочнікаў з Міністэрствам абароны, МУС, КДБ у цэнтры.

«Асабліва з Мінабароны. Каб вы бачылі, чулі і разумелі, што адбываецца на мяжы і за мяжой. Каб вы своечасова мяне праінфармавалі. І калі трэба вас падперці Узброенымі Сіламі, як гэта было летам, мы гэта зробім. Гэта ў маёй кампетэнцыі. І дапамога ўпраўленням КДБ і МУС на месцы. Вы ведаеце, якія задачы мы тут вырашалі (у жніўні пасля выбараў). Ім трэба аказаць дапамогу, — даручыў кіраўнік дзяржавы. — Зноў жа кажу: ***вельмі тонкая грань, вы не павінны нікога падмяняць. Вы не павінны наўпрост камандаваць і кіраваць начальнікамі УУС і УКДБ на месцах. Таму што ў іх ёсць свае начальнікі. А ў вас ёсць свой начальнік — Прэзідэнт»***.

Абавязак памочнікаў — трымаць кіраўніка дзяржавы ў курсе справы, каб у выпадку неабходнасці атрымліваць ад яго распараджэнні, як дзейнічаць па тых ці іншых кірунках.

Пра дружыны і мабільныя атрады

«Нам трэба нефармальнай зрабіць дзейнасць народных дружын, — працягнуў Прэзідэнт. — Яны пачалі працаваць, але яшчэ ў поўную сілу не разгарнуліся. Вы бачылі, як было ў Кыргызстане: абсалютны хаос, усе сілавікі разбегліся, няма каму абараняць краіну. Хто ўзяў на сябе адказнасць? Народныя дружыны. Яны падцягнулі міліцыянераў, якія паразбягаліся, спецслужбы і вайскоўцаў. І стварылі магутныя народныя дружыны. І цягам сутак затушылі ўсе пажары».

На яго думку, народныя дружыны павінны абараняць перш за ўсё ўласныя дамы.

«Вы ж паглядзіце, што адбываецца. Сёння я чытаю агляды: ах, Лукашэнка аддаў каманду працаваць у мінулую нядзелю ў прыцемках, як я казаў, у спальных раёнах. Слухайце, я на тое і галоўнакамандуючы. Я які закон парушыў? Гэта мая справа, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — І Караеву (на той час міністру МУС. — **«Зв.»**) не трэба тут апраўдвацца. Ён правільна сказаў учора: а як інакш міліцыі было зрабіць, калі яны (удзельнікі пратэснай акцыі. — **«Зв.»**) паперлі, узламвалі дзверы і рынуліся ў кватэры людзей. Мы ж не ведалі, з якой мэтай яны туды прыйшлі. Мы зыходзілі з горшага і мы абаранялі сем'і».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Хто-небудзь хоча, каб міліцыя і ваенныя сышлі з Мінска? Гэтага не будзе, пакуль я Прэзідэнт... ***Гэта мае функцыі і паўнамоцтвы — абараніць спакой і мір нашых грамадзян.*** Так будзе і надалей. Яны павінны гэта ведаць».

Ён дадаў, што ў мабільныя атрады варта прыцягваць былых вайскоўцаў.

Бяспека калектываў і студэнты

«Нам трэба абараніць працоўныя калектывы. Гэта датычыцца і Гродна, і Брэста, — працягнуў пералік задач перад сваімі памочнікамі Прэзідэнт. — Вось, кажуць, на «Гродна Азоце» аж пад сотню чалавек выйшла. Пачалі разбірацца, а там жа прышлых колькі з боку!.. Таму трэба абараніць тых рабочых, якія хочуць працаваць. І не толькі рабочых — настаўнікаў, урачоў і гэтак далей. Усіх, хто не хоча, жадаюць дэманстраваць... — я ўчора ці пазаўчора ўжо сказаў — на вуліцу, мы з імі лепш будзем на вуліцы разбірацца».

Аляксандр Лукашэнка дадаў: «Сёння ў нас вельмі цяжкая сітуацыя. Як ва ўсім свеце, людзей трэба лячыць. Мала «ковіда», у нас жа акрамя яго ёсць іншыя рэспіраторныя захворванні і іншыя, сезон пачаўся... Калі кажуць мне, што ўрач дзесьці разгарнуў гэты калабарацыянісцкі сцяг, мне дрэнна становіцца. Не кажучы ўжо пра настаўнікаў (я, праўда, у апошні час не чую)».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу і на акцыі ў тэатрах: «Людзі прыйшлі оперу паслухаць, спектакль паглядзець. Яны (пратэстоўцы. — **«Зв.»**) загадзя скупляюць квіткі, дзве-тры хвіліны, здымак зрабілі і разбегліся».

У сувязі з гэтым ён даручыў звярнуць увагу на работу тых, хто адказвае за бяспеку ў адпаведных установах культуры. «Чым яны там займаліся, чаму яны гэтага не бачылі? Ну а калі ўбачылі, якія меры прынялі? Ніякіх», — канстатаваў беларускі лідар.

«Вельмі важнае пытанне — бяспека студэнтаў, — дадаў Прэзідэнт. — Мы ўсё цяпер: вось, студэнты такія-сякія і іншае. Але трэба ж разумець, што там ёсць 10-15 чалавек... А астатнія — нармальныя людзі. Мы ж былі студэнтамі. Адзін пайшоў, а іншыя ідуць, думаюць: ну як застацца — штрэйкбрэхерамі абзавуць, адшчапенцамі, здраднікамі. Ну і ідуць натоўпам».

Аляксандр Лукашэнка таксама пракаментаваў намер некаторых студэнтаў з'ехаць вучыцца за мяжу: «Хто-небудзь хоча паехаць за мяжу вучыцца. Аб'яўляюць там палякі, літоўцы і іншыя. Не пытанне. Заўтра выпішам білеты, хай едуць. Але толькі ў лінгвістычным універсітэце вучаць замежным мовам. ***Паверце, у Польшчы, Чэхіі і нават у Літве людзей, якія ўмеюць размаўляць на замежных, англійскай ці нямецкай, мовах, дастаткова...*** Калі яны думаюць там вучыцца, ім там мазгі прамыюць, як гэта робяць палякі нашым хлопцам, якія там вучацца, і яны нам іх падкінуць як пятую калону... Гэтага не будзе. Я даручыў ураду — у найбліжэйшы час будуць прыняты меры аб непрызнанні дыпломаў, атрыманых за мяжой».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што так адкрыта кажа, каб студэнты разумелі, што можа быць. «Дала магчымасць дзяржава атрымаць адукацыю — ідзіце вучыцеся. Але яшчэ раз кажу: трэба забяспечыць бяспеку студэнтаў, якія хочуць вучыцца — а іх больш за 90 працэнтаў, — і асабліва рэктарам, кіраўніцтву і выкладчыкам», — паўтарыў ён.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Блізкая ўлада

ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ, ЖКГ І РАЗВІЦЦЁ ІНФРАСТРУКТУРЫ

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ правёў прамую лінію ў Лельчыцах.

Магчымасцю звярнуцца да губернатара скарысталіся жыхары раёна і абласнога цэнтра. Так, гамяльчанка Таццяна Васілеўская датэлефанавалася адна з першых. У жанчыны было некалькі пытанняў, уключаючы зямельную спрэчку. Пенсіянерка прасіла разабрацца з яе праблемамі з выездам на месца. Генадзь Салавей запэўніў, што ў пачатку наступнага тыдня сам будзе ў яе, перадае БелТА.

Жыхарка Лельчыц Іна Аляксееўна плануе рэканструкцыю свайго дома. Аднак, па яе словах, ёй адмаўляюць у адкрыцці крэдытнай лініі на гэтыя мэты. Старшыня аблвыканкама ўдакладніў: сапраўды, банк памяншае крэдытны партфель. Аднак ёсць і нюансы ў сітуацыі жыхаркі райцэнтра: фактычна яна жыве і працуе ў Лельчыцах, але юрыдычны адрас найменьніка — у Гомелі. Пытанне жанчыны будзе прапрацавана, падкрэсліў губернатар.

За 26-гадовую дачку Хрысціну прасіла жыхарка райцэнтра. Дзяўчына — інвалід трэцяй групы — хоча працаваць, але ёсць абмежаванні па здароўі. У райвыканкаме вывучаць вакансіі і падрыхтуюць прапановы для яе.

Фота БелТА.

На прыём да губернатара звярнуліся жыхары райцэнтра і сумежных раёнаў, а таксама з Гомеля і Клецка. Так, святар Аляксандр Кавалько прыехаў з Клецка. Ён расказаў, што ў вёсачцы Ганцавіцкага раёна людзі пачалі будаваць царкву. Асобныя агрепрадпрыемствы Гомельскага раёна маюць абавязак перад фермерскай гаспадаркай з Ганцавіцкага за пастаўленую прадукцыю. Заяўнік прасіў губернатара прааналізаваць сітуацыю з пагашэннем запазычанасці — гэтыя сродкі фермер плануе накіраваць на будаўніцтва храма.

Прадстаўнік ТАА «Утылізатар» прасіў разгледзець пытанне аб дзейнасці арганізацыі. Гамяльчанін таксама гатовы адкрыць вытворчасць кармоў для жывёлагадоўлі з харчовых адходаў. Кошт праекта — 5,5 тысячы еўра. «Новая вытворчасць заўсёды цікавая для рэгіёна. Рыхтуйце вашу прапанову, вывучым», — заўважыў Генадзь Салавей.

Некалькі маштабных у рамках раёна пытанняў агучыў губернатару Аляксандр Лісіцкі з Лельчыц. Ён унёс шэраг прапаноў па стварэнні вытворчасцяў у райцэнтры і ўладкаванні вуліч-на-дарожнай сеткі.

Сваю пазіцыю выказаў губернатар і з нагоды прапановы аб стварэнні новых працоўных месцаў у раёне. Генадзь Салавей упэўнены: у сельскай гаспадарцы праблем з вакансіямі няма. «На вёсцы вельмі запатрабаваныя людзі. Сёння сітуацыя такая, што на тры трактары адзін механізатар. У вобласці патрабуецца 525 даярак, 350 механізатараў. Не трэба баяцца жыцця на вёсцы», — падкрэсліў ён.

Усяго на прамую лінію губернатара датэлефанавалася пяць чалавек, яшчэ пяць прыйшлі на асабістыя прыём. Кожнае пытанне ўзятае на кантроль, дадзены даручэнні.

ТРАДЫЦЫЙНА ПА СУБОТАХ...

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператорчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 31 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васілевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

Да нас заляцела еўравосень

У пачатку лістапада будзе на 4-6 градусаў вышэй за норму

Ужо амаль тыдзень магутны цыклон з Паўночнай Атлантыкі спрабуе прабіцца на ўсход. Але шлях яму заступае шырокі блакавальны антыцыклон над Волгай. Пакуль наша краіна знаходзілася пад абаронай гэтага антыцыклону, дажджоў практычна не было. А вось у пятніцу сітуацыя змянілася, і ўладу над надвор'ем узялі франтальныя раздзелы з Заходняй Еўропы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Ўначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер слабы, пераменных напрамкаў. Начная тэмпература паветра — ад плюс 2 градусаў да 7 цяпла. Удзень — ад плюс 6 да плюс 11 градусаў.

Першы дзень апошняга месяца восені будзе не па сезоне цёплы. У многіх раёнах абыдзецца без ападкаў, толькі па Гомельскай вобласці месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер паўночна-ўсходні, усходні ўмераны. Ўначы — плюс 1—7 градусаў, а ўдзень — 6—12 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, пераважна без ападкаў. Ўначы і раніцай месцамі будзе туман. Вецер паўднёва-ўсходні, паўднёвы, ўначы слабы, удзень умераны. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 1 да плюс 7 градусаў, пры працяглых праясненнях — ад нуля да 2 марозу. Удзень чакаецца 6—12 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Фінансістам патрэбны банкноты — прымаюць любыя

Безадзыйны? Значыць, не адзывайце!

Як толькі ў нас з'яўляюцца лішнія грошы, то адразу ўзнікае пытанне, куды іх укласці, каб яны прынеслі нейкі дадатковы прыбытак. У фінансістаў наконт гэтага прапаноў хапае. Аналітыкі ўпэўненыя, што грошы павінны працаваць нават тады, калі поспехі ў эканоміцы не такія відавочныя.

Нягледзячы на спагнанне падаходнага падатку з працэнтаў, атрыманых па банкаўскім укладзе тэрмінам менш за год, кліенты банкаў часта размяшчаюць грашовыя сродкі ў беларускіх рублях на кароткія тэрміны. Сёння ў нас у краіне існуе некалькі прыватных банкаў, якія прапануюць узяць грошы кліентаў пад 23 % гадавых. Гэта рублёвыя ўклады на мінімальны тэрмін (35 дзён) з кіраваннем Smart стандарт, а дакладней, адкрыццё рахунку ў анлайн-рэжыме.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Максімальная стаўка па невялікіх тэрмінах (ад 2 месяцаў да паўгода) роўная ад 17 % да 19 % гадавых.

Сістэмныя (буйныя) банкі прапануюць безадзыйныя ўклады на 360 дзён і больш на ўмовах больш сціплых — 15-16 % гадавых. Наогул усе вышэйпрапанаваныя — **безадзыйныя** ўклады.

Адзыйны дэпазіт афармляецца на пэўны тэрмін, але пры жаданні вы можаце ў любы момант забраць свае грошы — цалкам або часткова. Ужо за саму магчымасць у любы час пакарыстацца сваімі грашыма кліент банка расплачваецца панежанымі працэнтамі. Самы выгадны адзыйны дэпазіт на пяць месяцаў прадугледжвае 7-14 % гадавых.

Калі вы здымаеце грошы датэрмінова, то працэнты налічваюцца і выплачваюцца за фактычны час захоўвання сродкаў па стаўцы, нізжэйшай за асноўную. Зараз умовы датэрміновага скасавання вельмі жорсткія. Дапусцім, ваш дэпазіт на пяць месяцаў, а грошы вы забралі ўжо праз месяц. У гэтым выпадку вам налічаць усяго некалькі працэнтаў даходу.

Безадзыйныя ўклады, наадварот, чакаюць свайго часу. Вы ўносіце грошы на дэпазіт і забіраеце іх толькі пасля заканчэння таго тэрміну, які ўказаны ў дагаворы. Сітуацыі бываюць розныя, і ў форс-мажорных абставінах банк можа пайсці вам насустрач і датэрмінова вярнуць грошы, але для гэтага патрэбныя важкія падставы.

Рост — і ў валютных дэпазітах

Вялікая колькасць нашых грамадзян, пачынаючы з ліпеня, пачалі актыўна скупляць замежную валюту. Такім чынам, стварыўся ажыятажны попыт на долары, пасля чаго яны сталі даражэць. Скупка валюты ў жніўні жыхарамі ажыццяўлялася большай часткай за кошт сродкаў, прызначаных для бягучых выдаткаў, а не доўгатэрміновых назапашванняў. У асноўным насельніцтва забірала грошы з бягучых рахункаў, гэта значыць траціла на набыццё валюты сваю зарплату. Што датычыцца доўгатэрміновых рублёвых зберажэнняў, то яны знізіліся на 5,5 %. Гэта параўнальна няшмат. Потым попыт на валюту ўпаў і долары патаннелі.

Людзі купілі долары па досыць высокім курсе, а цяпер гэтыя грошы проста ляжаць дома? Непарадак. А між іншым, многія банкі цяпер павысілі працэнты па валютных дэпазітах. Што мы маем?

Вось тут самыя кароткія тэрміны ўкладу прадугледжваюць самыя маленькія даходы. Найлепшыя ўмовы пры дэпазіце на 35 дзён — 1,25 % гадавых. Валютны ўклад на тэрмін ад 370 дзён павялічваецца да 2—2,5 % гадавых.

Адкрый дэпазіт — і атрымай зніжэнне стаўкі па крэдыце

Гэтая акцыя праводзіцца «Беларусбанкам» з 26 кастрычніка да 31 снежня бягучага года.

Па якіх крэдытах можна знізіць стаўкі? Калі вы бралі ў гэтым банку крэдыты на спажывецкія патрэбы ў рамках крэдытнага канструктара або крэдыт «інтэрнэт-безнаяўны» на тэрмін ад 1 да 3 гадоў, а таксама крэдыт «Партнёр Аптымальны», то зможаце знізіць сваю стаўку на 3 працэнтныя пункты.

У выпадку калі пасля зніжэння памеру працэнтаў стаўка па крэдыце перавысіць памер разлікавай велічыні стандартнай рызыкі (РВСР), усталяванай Нацбанкам на дату заключэння дадатковага пагаднення да крэдытнага дагавора — да РВСР, зніжаная стаўка будзе дзейнічаць да заканчэння тэрміну вашага крэдыту.

Каб стаць удзельнікам акцыі і знізіць стаўку па крэдыце, кліенту трэба адкрыць у гэтым банку любы з пералічаных ніжэй укладаў. Першы дэпазіт называецца «Акцыйны Безадзыйны» ў беларускіх рублях. Сума — ад 2500 рублёў, тэрмін — 13 месяцаў, даходнасць — да 14,5 % гадавых. Другі — «Класік Безадзыйны з фіксаванай працэнтнай стаўкай» у доларах ЗША. Сума — ад 1000 долараў, тэрмін — 13 месяцаў, даходнасць — ад 1,5 % да 2,3 %.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Чорны чацвер у Францыі: узброеныя напады ў Ніцы і Авіньёне

У цэнтры Ніцы ў царкве Нотр-Дам невядомы напаў на прыхаджан і турыстаў, якія знаходзіліся ў базіліцы. У выніку нападу загінулі тры чалавекі, двое з іх былі забітыя непасрэдна ў саборы, паведаміў мэр горада Крысціян Эстразі ў Twitter. Таксама вядома, што некалькі чалавек атрымалі раненні. Нападнік быў узброены нажом, адну з ахвяр ён абезгаловіў, перадалі BFMTV і Le Figaro. Як паведаміла Le Figaro, Эстразі заявіў, што злачынца крычаў «Алах акбар» і быў затрыманы пасля таго, як у яго стралялі паліцэйскія. Па інфармацыі France Bleu, адкрыта расследаванне па факце «забойства і замаху на забойства ў сувязі з тэрарыстычнай дзейнасцю», учыненых «злачыннай тэрарыстычнай супольнасцю». Расследаванне даручана судовай паліцыі і Генеральнай дырэкцыі ўнутранай бяспекі (DGSI). Прэм'ер Францыі Жан Кастэкс у канцы свайго выступлення ў Нацыянальнай асамблеі, прысвечанага новым мерам прадухілення каранавіруса (краіну захліснула другая хваля пандэміі), папрасіў дэпутатаў і членаў урада ўшанаваць хвілінай маўчання памяць аб загінулых, перадае Le Monde. «Несумненна, гэта новае выпрабаванне, якое ўдарыла па нашай краіне», — заявіў Кастэкс. Міністр унутраных спраў Жэральда Дарманен заявіў, што пры МУС створаны спецыяльны крызісны штаб. Праз некалькі гадзін пасля здарэння ў Ніцы стала вядома аб тым, што паліцыя ў Авіньёне застрэліла мужчыну, які спрабаваў напасці на вартавых парадку з нажом, паведаміла радыёстанцыя Europe 1. Па даных сілавікоў, ён выкрыкваў «Алах акбар» і пагражаў супрацоўнікам. У адказ паліцыя адкрыла агонь, у выніку чаго зламыснік памёр ад атрыманых раненняў.

У Еўропе хутка распаўсюджваецца новы від каранавіруса

Новы від каранавіруса, які ўпершыню быў выяўлены ў іспанскіх сельскагаспадарчых рабочых гэтым летам, распаўсюдзіўся па большай частцы Еўропы і зараз з'яўляецца прычынай большасці новых выпадкаў COVID-19 адразу ў некалькіх краінах. З новым варыянтам віруса звязана больш за 80 працэнтаў выпадкаў інфіцыравання ў Вялікабрытаніі, 80 % — у Іспаніі, 60 % — у Ірландыі і да 40 % — у Швейцарыі і Францыі. Навукоўцы адзначылі, што варыянт каранавіруса, які атрымаў назву 20A.EU1, распаўсюджваўся сярод насельніцтва еўрапейскіх краін нябачанымі раней тэмпамі. «Я не бачыла ніводнага варыянта [COVID-19] з такой дынамікай за ўвесь час вывучэння геномных паслядоўнасцяў каранавіруса ў Еўропе», — адзначыла кіраўнік даследавання, эвалюцыйны генетык Базельскага ўніверсітэта Эма Ходкрафт. Зрэшты, яна адзначыла, што пакуль у навукоўцаў няма доказаў таго, што хуткія тэмпы перадачы віруса звязаны з яго мутацыяй, якая павялічвае яго заразнасць.

ПАДНЯЦЦА НА НОВУЮ ВЫШЫНЮ

Навучанне пілотаў у краіне плануюць пачаць у наступным годзе. Аб гэтым расказаў дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Арцём СІКОРСКІ.

— Першых курсантаў разлічваем набраць у 2021 годзе. Ужо распрацаваны патрабаванні да ўступных іспытаў, фізічнага і псіхалагічнага адбору, медыцынскага агляду абітурыентаў. Дэпартамент распрацаваў авіяцыйныя правілы па падрыхтоўцы лётнага саставу. Зараз выбіраем паветраныя судны. Таксама рыхтуем праектную дакументацыю для будаўніцтва трэнажорнага цэнтра на тэрыторыі Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі.

Тэарэтычная падрыхтоўка пілотаў будзе праходзіць на базе Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі, лётная — на базе Мінскага аэраклуба ДТСААФ. Зацікаўленасць у лётнай падрыхтоўцы курсантаў выказаў аэраклуб «Дайманд». Аб'ём гадзін, якія павінны налётаць курсанты, адпавядае міжнародным стандартам — 200 гадзін. Лётная падрыхтоўка будзе праводзіцца ў адпаведнасці са стандартамі Еўрапейскага агенцтва па бяспецы палётаў, каб забяспечыць максімальную канкурэнтаздольнасць выпускнікоў на рынку працы. Арцём Сікорскі звярнуў увагу, што на сёння попыт на авіяцыйных спецыялістаў як у Беларусі, так і за мяжой досыць вялікі.

Спецыяліст таксама закрануў тэму правядзення палётаў ва ўмовах пандэміі.

— Меры, якія мы пачалі выконваць яшчэ ў пачатку з'яўлення каранавіруса, даказалі сваю высокую эфектыўнасць. Напрыклад, увядзенне электронных пасадачных талонаў, самастойная здача багажу пасажырамі, стойкі самарэгістрацыі і іншае дазволілі максімальна засцерагчы ўсіх і разам з тым стварыць бяспечнае асяроддзе для пералётаў. З-за таго, што Беларусь не спыняла пералёты па адкрытых напрамках, у тым ліку ў перыяд пандэміі, мы сталі «гуманітарным калідорам» для грамадзян з многіх краін, выконвалі рэйсы па дастаўцы гуманітарнай дапамогі фактычна па ўсім свеце, замежныя дзяржавы выказвалі нам падзяку, Міжнародная арганізацыя грамадзянскай авіяцыі высока ацаніла нашы намаганні.

Кожнае з авіяцыйных прадпрыемстваў у гэты перыяд распрацавала план антыкрызісных мер. «Мы не дапусцілі скарачэння персаналу, аптымізавалі бізнес-працэсы. Разам з тым не спынілі работу па рэалізацыі значных праектаў. Напрыклад, ужо скончаны работы па рэканструкцыі аэрадрома «Орша», у найбліжэйшы час плануецца выкананне тэхнічнага рэйса, дзе будуць правераны ўсе сістэмы, і ў хуткім часе аэрадром будзе дапушчаны да эксплуатацыі. Заканчваецца таксама наладка абсталявання ў новым цэнтры кіравання паветраным рухам, цэнтр будзе ўведзены ў эксплуатацыю ў пачатку наступнага года. Рэалізаваны буйны інвестыцыйны праект па будаўніцтве Цэнтра бізнес-авіяцыі ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. Важны кірунак на сёння — эксплуатацыя беспілотных лятальных апаратаў. Ужо сфарміравана каманда прафесіяналаў, якая працуе ў гэтым рэчышчы».

«З-за таго, што Беларусь не спыняла пералёты па адкрытых напрамках у тым ліку ў перыяд пандэміі, мы сталі «гуманітарным калідорам» для грамадзян з многіх краін, выконвалі рэйсы па дастаўцы гуманітарнай дапамогі фактычна па ўсім свеце».

Аб рабоце ў няпростых умовах расказаў і **першы намеснік генеральнага дырэктара па арганізацыі вытворчасці авіякампаніі «Белавія» Глеб ПАРХАМОВІЧ:**

— Авіякампанія сутыкнулася з сур'ёзнымі выклікамі ў бягучым годзе па зразумелых прычынах. Рост аб'ёму пасажырскіх перавозак быў больш за 40 %. Мы з аптымізмам глядзелі ў будучыню, але, на жаль, пандэмія прымусіла ўнесці сур'ёзныя карэктывы ў нашу работу. У красавіку пасажыраапаток склаў менш за 8 % ад паказчыкаў аналагічнага перыяду мінулага года, у маі — 12 %. Тым не менш мы не скарацілі штат работнікаў, больш за дзве тысячы чалавек працуюць дагэтуль, да таго ж мы не адмовіліся ад планаў размеркавання з Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі, больш за 20 выпускнікоў узялі да сябе. Мы зрабілі шмат крокаў для таго, каб застацца на плаве.

Авіякампанія працягвае выконваць свае фінансавыя абавязацельствы перад усімі партнёрамі. Сумесна з Банкам развіцця рэалізоўваецца тры этапы інвестыцыйнага праекта па набыцці паветраных суднаў, на сёння нашы крэдытныя абавязкі складаюць прыкладна 90 мільёнаў доларау. Сёлета ўсе свае абавязкі перад Банкам развіцця мы выканалі па графіку і без затрымак.

Планы на гэты год у авіякампаніі былі грандыёзныя, адзначыў спікер, аднак з улікам пандэміі іх прыйшлося скарэктаваць.

— Але нягледзячы на складанасці, мы адкрылі два новыя напрамкі: Ташкент і Вена. На сёння гэтыя палёты выконваюцца. Калі гаварыць пра планы на наступны год, то ўсё будзе залежыць ад рынку і тых умоў, у якіх мы будзем далей працаваць. Разлічваем, што па аб'ёме перавозак пасажыраў у параўнанні з мінулым годам выйдзем на 40-45 %, па пасажырапатоку — на 45-50 %. У цяперашніх умовах гэта добры паказчык, які дазволіць у першую чаргу выконваць нашы фінансавыя абавязацельствы як перад калектывам, так і перад партнёрамі.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

На краі жыцця

У КНІЗЕ І ЯВАХ

Міхаіл МАРГУЛІС — амерыканец, чыё імя вядомае ў Беларусі. Неаднойчы наведваўся ў Мінск. Аўтар многіх публікацый, звязаных з палітычнымі, грамадскімі падзеямі ў краіне, у тым ліку і асобнай кнігі, прысвечанай Беларусі. Сустракаўся з нашым Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам. У ЗША выпускаў часопіс, які распавядаў пра нашу краіну.

І вось у Беларусі ў выдавецтве «Галіяфы» выйшла новая кніга М. Маргуліса — «Адзін на адзін з жыццём: з успамінаў». Каб як мага больш лаканічна ахарактарызаваць змест; давесці, аб чым расказвае кніга, прэзентацыя якой павінна адбыцца ў Мінску ў канцы лістапада (зразумела, з удзелам самога аўтара), працытую адзін абзац з прадмовы: «Усё можна вярнуць у гэтым жыцці: славу, грошы і нават каханне. Не вернецца ніколі толькі час. Час не вяртаецца. Учарашні дзень сышоў, заўтра можа не прыйсці, у нас ёсць толькі — Сёння. Таму толькі сёння можна зрабіць добрую справу для людзей і для Бога». Пра тых людзей, каго любіў і любіць, хто яму цікавы, каго ён рашуча падтрымліваў; пра тыя ідэі, якія ён імкнуўся і імкнецца данесці да грамадства; пра напамін усім, што ёсць Вера і Бог, — старонкі надзвычай цікавых нататак кнігавыдаўца, грамадскага дзеяча, аўтара многіх праектаў духоўнай дыпламатыі, чалавека, які сваім жыццём даказвае, што няма лепшай долі, чым рабіць добрыя справы.

У кнізе «Адзін на адзін з жыццём...» чытача чакаюць сустрэчы з рускім празаікам Віктарам Някрасавым, аўтарам легендарнай аповесці «У акопах Сталінграда», Яўгенам Еўтушэнкам, мастаком Міхаілам Шамякіным, амерыканскім мастаком Сяргеем Галербахам, паэтам Навумам Каржавіным, рэдактарам эмігранцкага «Континента» Уладзімірам Максімавым, акцёрам Сяргеем Юрскім, паэтам Андрэем Вазнясенскім, палітыкамі Міхаілам Гарбачовым, Русланам Хасбулатавым, патрыярхам Алексіем II, публіцыстам Юрыем Шчакаціхіным, казахскім літаратарам Бахытам Кенжэевым... Падрабязна расказвае М. Маргуліс пра стварэнне ў Фларыдзе Сусветнага духоўнага цэнтра.

Адкрыццём для мяне стала ў кнізе «Адзін на адзін з жыццём...» знаёмства з перакладчыцай твораў Міхаіла Булгакава, Ісаака Бабеля, Міхаіла Зошчанкі, Аляксея Рэмізава, Юрыя Тынянава на англійскую мову Мірай Гінзбург (эсэ «Перакладчыца карыфеяў»), якая нарадзілася ў Бабруйску. Раман «Майстар і Маргарыта» яна пераўвасобіла на англійскую ў 1967 годзе. Чытаем у Маргуліса: « — Як жа вам удалося захаваць усе нюансы рускай мовы, — цікаўлюся я, — вы ж у адрыве ад яе?

Яна памаўчала, сказала:

— Не ведаю... Яна жыве ўва мне. Калі чалавек, якога вы любіце, жыве ў вас, вы будзеце яго адчуваць, ім жыць. Так і мова.

Высветлілася, што яна ліставалася з Карнеем Іванавічам Чукоўскім. Яны напісалі адно аднаму каля шасцідзесяці лістоў...»

Эсэістычная, у чымсьці дзённікавая кніга Міхаіла Маргуліса, чалавека, якога хвалявалі і хвалююць памкненні да ўсталявання міру, сапраўдных дэмакратычных, гуманістычных каштоўнасцяў ва ўсім свеце, чытаецца лёгка, але разам з тым патрабуе разваг, асэнсавання. Спадзяёмся, што з апошнім беларускаму чытачу дапаможа разабрацца і тая прэзентацыя выдання, якая запланавана ў Мінску.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Отчет за январь–сентябрь 2020 года
ООО «Санта Ритейл»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 сентября 2020 года

тыс. руб.

АКТИВЫ	Код строки	На 30.09.2020	На 31.12.2019
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	197 404	112 793
Нематериальные активы	120	3 228	2 015
Вложения в долгосрочные активы	140	24 855	26 658
Долгосрочные финансовые вложения	150	50 512	55 218
Прочие долгосрочные активы	180	218	476
ИТОГО по разделу I	**190**	**276 217**	**197 160**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	45 067	27 859
в том числе: материалы	211	4 897	2 153
готовая продукция и товары	214	40 170	25 706
Расходы будущих периодов	230	17 263	16
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	8 605	3 535
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	17 170	6 652
Краткосрочные финансовые вложения	260	54 295	56 019
Денежные средства и их эквиваленты	270	3 405	6 974
ИТОГО по разделу II	**290**	**145 805**	**101 055**
БАЛАНС	**300**	**422 022**	**298 215**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	на 30.09.2020	на 31.12.2019
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	134 307	72 288
Резервный капитал	440	15	15
Добавочный капитал	450	4 068	4 090
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	-1 402	12 136
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	326	
ИТОГО по разделу III	**490**	**137 314**	**88 529**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	164 494	145 138
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	510	2 550	
Отложенные налоговые обязательства	520	201	113
ИТОГО по разделу IV	**590**	**167 245**	**145 251**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610		
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	63	119
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	115 406	64 316
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	105 768	60 937
по авансам полученным	632	432	150
по налогам и сборам	633	633	385
по социальному страхованию и обеспечению	634	1 284	448
по оплате труда	635	3 452	1 806
по лизинговым платежам	636	3 711	386
прочим кредиторам	638	126	204
Доходы будущих периодов	650	1 994	
ИТОГО по разделу V	**690**	**117 463**	**64 435**
БАЛАНС	**700**	**422 022**	**298 215**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–сентябрь 2020 года

тыс. руб.

Наименование показателей	Код строки	За январь–сентябрь 2020	За январь–сентябрь 2019
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	422 390	269 071
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(328 611)	(216 739)
Валовая прибыль (010-020)	030	93 779	52 332
Управленческие расходы	040	(8 713)	(5 919)
Расходы на реализацию	050	(94 655)	(51 600)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	(9 589)	(5 187)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	18 270	12 361
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(5 192)	(2 880)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060±070-080)	090	3 489	4 294
Доходы по инвестиционной деятельности	100	3 923	3 788
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	2 492	108
проценты к получению	103	1 431	3 678
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104		2
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(2 118)	(281)
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(2 118)	(281)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112		
Доходы по финансовой деятельности	120	13 634	7 543
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	13 634	7 543
Расходы по финансовой деятельности	130	(18 512)	(11 559)
в том числе: проценты к уплате	131	(9 391)	(5 824)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(8 832)	(5 564)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(289)	(171)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	(3 073)	(509)
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	416	3 785
Налог на прибыль	160		
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	(89)	95
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190		
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(1)	(1)
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	326	3 879
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220		
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	326	3 879

УНП 291313486

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ № 8275338 **считать недействительным.**
УНП 100122726

Майстар-клас

СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ — У АДНЫМ ЯБЛЫКУ

Ці стаў бы Тадэвуш Касцюшка нацыянальным героем, калі б яму дазволілі ажаніцца з каханай жанчынай?

Уявіце сабе, што перад вамі расклалі пяць малюнкаў з выявамі Эйфелевай вежы, кенгуру, сэрца, банкнота і сілуэта жанчыны і прапанавалі падумаць, што іх усе можа аб'яднаўваць. Такі прыём асацыятыўнага рада выкарыстоўвае на ўроках настаўнік гісторыі з Ушацкай сярэдняй школы Уладзімір ХАМЁНАК. На сваім майстар-класе падчас EdCamp Belarus — 2020 педагог расказаў, як яму ўдаецца павышаць пазнавальную актыўнасць школьнікаў праз канструяванне вобразаў і падзей мінулага.

Уладзімір ХАМЁНАК: «Ці проста запамінаць мноства гістарычных дат і падзей? А калі іх візуалізаваць?»

Міфічны герой

— 90 працэнтаў людзей — візуалы, якія ўспрымаюць інфармацыю са зрокавых вобразаў. Мы жывём у свеце гаджэтаў, і нас акружае вялікая колькасць інфармацыі. Усё гэта стварае праблемы для гістарычнай адукацыі. Калі мы глядзім тэлевізар або чытаем нейкую літаратуру, то бачым, што гістарычным падзеям прысвячаецца апошнім часам вельмі шмат увагі. Але праблема ў тым, што нават дарослыя, якія глядзяць гістарычны фільм, успрымаюць убачанае як праўдзівую інфармацыю, не гаворачы ўжо пра дзяцей, — кажа настаўнік. — У такіх умовах даволі складана захоўваць навуковую аб'ектыўнасць.

Канструяванне вобразаў, падзей і персанажаў гістарычнай даўніны на ўроках гісторыі дазваляе, на думку педагога, павышаць інтарэс у навучэнцаў праз іх асабістае эмацыянальна-каштоўаснае стаўленне да вучэбнага матэрыялу.

— Што такое вобраз? Гэта ўяўленне пра каго-небудзь ці што-небудзь, якое адрозніваецца ад стэрэатыпаў, узнікае ў індывідуальным парадку і не перадаецца ў гатовым выглядзе. Вобразы часта ўзнікаюць на эмацыянальным і кагнітыўным узроўнях. Вывучаючы гісторыю, мы маем справу не з рэальным мінулым, а з вобразамі гісторыі. «Аляксандра складана ўявіць жывой гістарычнай асобай. Здаецца, што ён, хутчэй за ўсё, міфічны герой. Аляксандр быў вучнем мудрага Арыстоцеля, прыхільнікам вялікага Гамера. Ён быў настолькі прыгожы, што першы ў Грэцыі пачаў галіць бараду». Пра каго ідзе размова? — запытаўся ў калег Уладзімір Хамёнак. — Правільна, пра Аляксандра Македонскага. Апішыце, каго вы зараз сабе ўяўляеце. Высокі, з атлетычным целаскладам, прыгажун... Але гэта толькі вобраз, магчыма, вельмі далёкі ад рэчаіснасці. Для кожнага гістарычнага персанажа сёння можна знайсці цэлую галерэю партрэтаў, у тым ліку і ў кінематографе, і прадставіць яе дзецям.

У пачатку навучальнага года, для таго каб зацікавіць сваім прадметам навучэнцаў, педагог карыстаецца аўтарскім метадам так званага гістарычнага яблыка. Дзецям задаецца пытанне: «А ці зможа ўся сусветная гісторыя змясціцца ў адным яблыку?» І тут жа тлумачыцца: яблык Евы, анатамічны яблык Адама, эстэтычны яблык Парыса, дэструктыўны яблык Вільгельма Тэля, гравітацыйны яблык Ньютана, структурны яблык Поля Сезана, ІТ-яблык Стыва Джобса. Такім чынам, на цалкам візуальным прадмеце прадстаўлена ўся сусветная гісторыя, што спрыяе запамінанню яе перыядызацыі.

Самы вядомы беларус

Мнематэхніка — адзін з прыёмаў канструявання на ўроках гісторыі вобразаў мінулага, які спрашчае запамінанне інфармацыі з дапамогай складання асацыятыўных сувязяў і візуалізацыі аб'ектаў. Ці проста запамінаць мноства гістарычных дат, падзей, назваў, тэрмінаў і паняццяў, якія прысутнічаюць у школьнай праграме? А калі іх візуалізаваць, так будзе запомніць прасцей?

Напрыклад, пры вывучэнні тэмы па гісторыі Беларусі ў сёмым класе «Паўстанне 1794 года» Уладзімір Хамёнак першапачаткова прапануе шэраг асацыяцый з мэтай фарміравання аднаго вобраза: гэта Эйфелева вежа, кенгуру, сэрца, амерыканскі банкнот, жанчына...

— Прашу вучняў падзяліцца тым, што яны бачаць, і іх асацыяцыямі з гэтымі выявамі, — прапаноўвае педагог. — Сэрца — гэта каханне, кенгуру — Аўстралія, доларавая купюра — Амерыка, вежа — духі, каханне, Францыя, жанчына — радзіма. А аб'яднаўвае іх усе адна гістарычная асоба — Тадэвуш Касцюшка. Па карцінках дзеці запамінаюць этапы яго жыцця. Напрыклад, можна задаць пытанні: «Што з вышэйпералічанага з'яўляецца вызначальным у жыцці знакамітага земляка?» ці «Якія матывы былі ў Тадэвуша Касцюшкі? Каханне, напрыклад, магло стаць такой прычынай?»

Ёсць меркаванне, што нашага славутага земляка зрабіла выдатным воінам менавіта няшчаснае каханне. І што невядома, ці стаў бы ён нацыянальным героем двух кантынентаў, калі б яму дазволілі ажаніцца з каханай жанчынай. Асцерагаючыся расправы, ён бяжыць у Парыж, затым накіроўваецца ў Паўночную Амерыку, дзе прымае ўдзел у вайне за незалежнасць. Пасля вяртаецца на радзіму і становіцца героем паўстання. А ў Аўстраліі іменем героя названая самая высокая гара на кантыненце, якая з'яўляецца сімвалам яго славы...

Яшчэ адзін метад — мультысэнсарнага успрымання — прапануе алгарытм, які педагог выкарыстоўвае ў рабоце з навучэнцамі: вобраз — слова — дзеянне. Метад мультысэнсарнага успрымання карціны ўключае ў сябе адказы на пытанні. Задача навучэнцаў — адказваць паслядоўна, бо ў адваротным выпадку парушаюцца логіка і ход падзеі.

— У дзявятым класе на ўроку сусветнай гісторыі па тэме «Палітычнае развіццё савецкай дзяржавы» ў пачатку ўрока я прапаную навучэнцам два варыянты карціны «Ленін абвяшчае савецкую ўладу на II з'ездзе Саветаў», — прыводзіць прыклад Уладзімір Хамёнак. — Пасля гэтага навучэнцам прапануецца адказаць на наступныя пытанні. Якая падзея намалявана на карціне? У чым адрозненне малюнкаў? Хто адсутнічае на першай і на другой карціне? Чаму? Як склаўся далейшы лёс тых, хто адсутнічае на малюнку? Гэты метад развівае навыкі работы з інфармацыяй з розных крыніц, пошуку нестандартных рашэнняў, фарміруе ўстойлівы інтарэс да прадмета, — кажа Уладзімір Хамёнак. — Можна таксама прапанаваць дзецям розныя карціны з Кастусём Каліноўскім, каб яны паразважалі наконт таго, а які вобраз нацыянальнага героя больш міфалагічны і чаму? І ці адпавядаё ён гістарычнай рэчаіснасці?

Дапамажыце Ганне Пятроўне!

Ці патрэбная ў школе дэмакратыя? З такога пытання, адрасаванага калегам, распачалі свой майстар-клас на EdCamp-2020 **дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ Міхась КУДЗЕЙКА і начальнік Цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі АПА Алена РАДЗЕВІЧ.** Дэмакратычная адукацыя — што гэта значыць? Удзельнікам было прапанавана паразважаць над гэтымі пытаннямі і даць адказ у канцы «ўрока».

— Той, хто думае, што дэмакратыя на ўроку азначае свята непаслухмянасці — маўляў, што хочаш, тое і робіш, сур'ёзна памыляецца. Такое бачанне дэмакратыі — далёкае ад рэчаіснасці, — падкрэслівае Алена Радзевіч. — Распачынаць рух у гэты бок мы прапанавалі б з сумеснага вызначэння вучнямі правіл узаемадзеяння ў калектыве, складання, так бы мовіць, Канстытуцыі класа. Напрыклад, выказванні кожнага з'яўляюцца важнымі. Слухаем адзін аднаго не перапыняючы. На занятках адключаем гук тэлефона. Абражаць адзін аднаго нельга, усміхацца можна і гэтак далей. Калі дзеці самі ўстанаўліваюць правілы, яны будуць іх прытрымлівацца. Гэта іх сумесна прынятая рэзалюцыя...

— А я хацеў бы пазнаёміць усіх з такой методыкай сацыяльнага і псіхалагічнага развіцця школьнікаў, як лялька-асоба, — прапанаваў Міхась Кудзейка, трымаючы ў руках умоўную гераіню — ляльку. — Гэта Ганна Пятроўна — настаўнік з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй, яе педагагічны стаж складае 30 гадоў. Яна вельмі любіць сваю работу і ганарыцца тым, што яна настаўніца. Яе працоўныя дасягненні адзначаныя ганаровымі граматамі. Некалькі былых вучняў абралі педагагічную прафесію. Ганна Пятроўна лічыць, што яе заслуга ў гэтым таксама ёсць. У школе яна мае аўтарытэт. Да яе з павагай ставіцца адміністрацыя, прыслухоўваюцца бацькі, бо лічаць добрым і надзейным педагогам. Але Ганна Пятроўна вырашыла падзяліцца з намі сваёй праблемай. Яна лічыць сябе творчым педагогам, таму на ўроках імкнецца выкарыстоўваць як мага больш наглядных дыдактычных матэрыялаў, прэзентацый і гульняў. Але апошнім часам матывацыя ў яе выхаванцаў да вучэбнай дзейнасці чамусьці знізілася. Нягледзячы на тое што яна старанна рыхтуецца да ўрокаў, каб зрабіць іх больш разнастайнымі і цікавымі, вучні не праяўляюць зацікаўленасці да іх зместу, зусім неактыўныя ў выкананні прапанаваных заданняў. Ганна Пятроўна заўважыла, што дзеці з большай радасцю і інтарэсам «завісаюць» у сваіх тэлефонах на перапынках, чым задаюць пытанні. Спрабавала правадзіць гутаркі пра важнасць ведаў у жыцці і з дзецьмі, і з іх бацькамі, але чаканага эфекту не дасягнула. Спрабавала выкарыстоўваць стымуляцыйнае ацэньванне, нават раз-пораз парушаючы нарматыўныя патрабаванні да выстаўлення адзнак, але і гэта не дало выніку, бо жаданне мець высокі бал ніяк не стасуецца з жаданнем працаваць на ўроку. Апошнім часам Ганна Пятроўна вырашыла павысіць матывацыю вучняў праз развіццё выхаваўчай работы, распрацавала грунтоўны план, уключыла ў яго цікавыя мерапрыемствы, але і гэта не прынесла плёну. «Кожны раз на бацькоўскіх сходах мы разам абмяркоўваем праблему матывацыі дзяцей да вучобы, але прыходзім да высновы, што яны змяніліся, і акрамя гаджэтаў іх нічога не цікавіць. Я не ведаю, што рабіць. Дапамажыце мне», — просіць Ганна Пятроўна. Што вы, калегі, параіце настаўніцы?

Міхась КУДЗЕЙКА: «Калегі, што мы параім Ганне Пятроўне?»

Удзельнікі майстар-класа не прымусілі чакаць, хоць, не выключана, што хтосьці з іх мог убачыць сябе на месцы ўмоўнай Ганны Пятроўны:

— А вы пыталіся ў вучняў, што ім цікава?

— Дзеці павінны бачыць сэнс у тым, што яны робяць на занятках. Калі гэта будзе звязана з іх жыццём, з тым, што іх турбуе, інтарэс абавязкова з'явіцца...

— Можа, трэба пашукаць праблему ў сабе? Ганна Пятроўна, я вельмі раіла б вам знайсці для сябе яшчэ нешта, акрамя школы. Вы ўжо празмерна зацыкліліся на сваёй рабоце і, магчыма, становіцеся не вельмі цікавым чалавекам. Трэба, каб вучні бачылі ў вас не толькі настаўніка з 30-гадовым стажам, а яшчэ і цікавую асобу.

— А прапануйце дзецям самім правесці такі ўрок, на якім ім было б цікава...

Выбар і адказнасць

— Многія настаўнікі, як і наша Ганна Пятроўна, «пакутуюць» ад таго, што дакладна ведаюць, як будзе лепш. Але вельмі важна зрабіць крок насустрач вучню і спытаць у дзяцей, а што цікава ім? Выслухаць, улічыць іх прапановы. Магчымасць выказацца ўсім, быць пачутымі, сумесныя прыняцце рашэнняў — надзвычай важны складнік дэмакратыі, — падкрэслівае Алена Радзевіч. — Але некалькі вучні вольныя ў выбары формы і зместу ўрока?

— Насамрэч яны не маюць выбару нават у тым, з кім сядзець за партай, калі харчавацца, у якой лакацыі займацца і ў што апранацца, — з сумам канстатавалі настаўнікі.

Але пасля наведвання «педагагічнага кафэ» для ўсіх аказалася сапраўдным адкрыццём, што, аказваецца, свабодным можна быць не толькі ў выбары дамашняга задання. Прыклад — тэма «Кругаварот вады ў прыродзе». У якасці галоўнай «стравы» было прапанавана адно заданне на выбар: можна было прыдумаць і прачытаць рэп з тлумачэннем таго, што адбываецца падчас кругавароту вады ў прыродзе, прыдумаць ці паказаць пантаміму або напісаць сінквейн (кароткі верш, які складаецца з пяці радкоў, што не маюць рыфмы) аб гэтым прыродным працэсе.

Трэба прызнаць, што рэп у выкананні настаўнікаў, якія прымерылі на сябе ролю вучняў, аказаўся проста фантастычным!

— Магчымасць выбару — вельмі важная. Калі яна ёсць, мы фарміруем адказную ініцыятыўную асобу. Выбар — гэта не толькі свабода, але і адказнасць! — падкрэсліваюць Міхаіл Кудзейка і Алена Радзевіч. — Вучань ведае, што ён можа што-небудзь прапанаваць і будзе пачуты. Важны прынцып дэмакратычнай адукацыі — сістэматычнае яе прымяненне, а не ад выпадку да выпадку, яна павінна стаць вашай педагагічнай філасофіяй. Дэмакратыя — гэта асэнсаваны выбар. Выдатны педагог Януш Корчак казаў: «Нішто не можа быць пабудавана без дзіцяці», а заснавальнік парыжскай дэмакратычнай школы Рамін Фарханджы лічыў, што дэмакратыі нельга навучыць, трэба паўсюдна стварацъ умовы, і яна прарасце сама...

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота арганізатараў EdCamp Belarus — 2020.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703**
Продавец	**ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

Предмет аукциона
Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16

Наименование	Общая площадь, кв. м	Инвентарный номер	Адрес (№ дома)
Лот № 1			
Производственный корпус	1130,5	500/С-49698	16
Диспетчерская	54,7	500/С-53818	16/12
Здание специализированное иного назначения (литейный цех)	7664,8	500/С-47329	16
Производственный корпус	4340,5	500/С-53224	16/1
Компрессорная	473,6	500/С-54017	16/15
Электропечь термическая	39,8	500/С-54018	16/16
Здание весовой	24,3	500/С-54019	16/17
Административно-хозяйственный корпус	2323,4	500/С-49697	16/23
Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкрановый путь, дорожки, подпорные стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница			
Склад	2328,4	500/С-53297	16/2
Склады	895,5	500/С-53808	16/8
Склады, гаражи	453,6	500/С-53897	16/9
Склады, административные помещения, агрегатные	563,7	500/С-53846	16/10
Инженерный корпус	3348,6	500/С-46093	16
Административно-производственный корпус № 4	19710,5	500/С-53638	16/3
Склад	2193,5	500/D-708019487	д.16п.2
Строительный цех	507,9	500/С-53845	16/11
Насосная станция автоматического пожаротушения	194,4	500/С-54016	16/14
Станция очистки сточных вод	305,1	500/С-54015	16/13
Градирня	39,1	500/С-55130	16/18
Ливневая канализационная сеть	1077,5 м	500/С-1029279	16
Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть	973,2 м	500/С-1029266	
Хозяйственно-бытовая канализационная сеть	764,5 м	500/С-1029275	
Тепловая сеть	236,7 м	500/С-1029272	

Иное имущество, входящее в состав лота: внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), кабельные телефонные сети (инв. № 12030041), оборудование распред. пункта РП-2 (инв. № 13041207), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсаторные установки (инв. №№№ 13040254, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), трансформаторные подстанции (инв. №№№ 13040099, 13040120), пульт распределительный (инв. № 13040780), комплекты трансф. подстанции (инв. №№№ 13040082, 13040076, 13040053, 13040030), комплект. распред. устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсатная установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты грузовые (инв. №№№ 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопассажирский (инв. № 28240071), объекты растительности (деревья 10 шт., газоны 10 шт.)

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохранной зоне; в охранных зонах электрических сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределительной системы (пл. 0,0024 га), недвижимых материальных историко-культурных ценностей (пл. 0,5035 га)

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 20 870 640,43 бел. руб. (снижена на 30 %)

Лот № 2			
Производственный корпус № 2	9 755,90	500/С-53630	16/5
Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкрановые пути, дорожки, подпорные стены, бордюр 0,16, ограждения, ворота			
Ливневая канализационная сеть	122,3 м	500/С-1029278	16/5
Хозяйственно-бытовая канализационная сеть	305,6 м	500/С-1029274	
Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть	133,3 м	500/С-1029268	

Иное имущество, входящее в состав лота: низковольт. конденсат. установка (инв. №№№ 13040142, 13040219), комплектное распред. устройство (инв. № 13040018), силовой трансформатор (инв. № 13041176Д), комплект. трансф. подстанции (инв. № 13040047), конденсаторные установки (инв. №№№ 13040314, 13040308, 13040550, 13040231, 13040248), трансформаторная подстанция (инв. № 13040107), электросиловой трансформатор (инв. № 13041176), агрегат выпрямительный (инв. № 13050608), объекты растительности (деревья 14 шт., газоны 4 шт.)

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу для производства машин и оборудования (машиностроения) на праве временного пользования пл. **1,9448 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохранной зоне; в охранных зонах электрических сетей (пл. 0,0476 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,3316 га), канализации (пл. 0,0191 га), теплоснабжения (пл. 0,1005 га), объектов газораспределительной системы (пл. 0,0432 га)

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 260 166,29 бел. руб. (снижена на 30 %)

Лот № 3			
Заводоуправление	2763,5	500/С-53298	16/4
Составные части и принадлежности: проезд, дорожка, площадки, ограждение, бордюры			
Производственный корпус	13365,7	500/С-45217	16/24
Технологическая котельная	200,30	500/С-53824	16/7
Тепловая сеть	43,8 м	500/С-1029271	16/4
Ливневая канализац. сеть	547,1 м	500/С-1029280	
Хозяйственно-бытовая канализационная сеть	161,3 и 169 м	500/С-1029273, 500/С-1029277	
Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть	68,4 и 295,1 м	500/С-1029269, 500/С-1029267	16

Иное имущество, входящее в состав лота: внутриплощадочные кабельные сети (инв. № 12020084), кабельные телефонные сети (инв. № 12030035), комплект. трансф. подстанции (инв. № 13040065), конденсатная установка низ. напр. (инв. № 13040194), конденсаторные установки (инв. №№№ 13040294, 13040283, 13040171), низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040202), объекты растительности (деревья 13 шт., газоны 2 шт.)

Сведения о земельных участках, предоставленных продавцу для размещения объектов иного назначения:
1) на праве временного пользования пл. **1,94 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохранной зоне; в охранных зонах линий связи и радиофикации (пл. 0,0268 га), в охранных зонах электрических сетей (пл. 0,0339 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4485 га), канализации (пл. 0,1234 га), теплоснабжения (пл. 0,0322 га), объектов газораспределительной системы (пл. 0,0975 га), недвижимых материальных историко-культурных ценностей (пл. 0,3730 га);
2) на праве долевой аренды (срок действия по 31.03.2026) для размещения технологической котельной пл. **0,0991 га** с ограничениями

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 18 619 054,40 бел. руб.

Обременения: площади зданий частично сданы в аренду. Здания с инвентарными номерами 500/С-53224 (лот № 1), 500/С-46093 (лот № 1), 500/С-53298 (лот № 3) находятся в залоге у банков. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
В соответствии с градостроительным проектом детального планирования на земельных участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекательного, выставочно-музейного, музейно-просветительского назначения, многоуровневой автостоянки.
На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота

Задаток 1 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**20** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.09.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**13.11.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**11.11.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Черметремонт», Минская обл. Минский р-н, аг. Гатово, Новодворский с/с (тел. +375 17 348 37 29) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 216-7Б/2019**

Предмет аукциона: оборудование, бывшее в употреблении
Местонахождения:
Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово

№ лота	Инв. № по бух. учету	Наименование	Начальная цена без учета НДС, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.	Затраты на проведение аукциона, бел. руб.
1	622	**Станок заточной универсал. 3Е642Е**	**3 000,00**	150,00	105,00
2	277	**Станок зубофрезерный 53А80Н**	**5 700,00**	285,00	200,00
3	11	**Станок кругло-шлифовальный 3М-151**	**3 000,00**	150,00	105,00
4	1224	**Станок ленточно-пильный РР 362 G**	**4 400,00**	220,00	145,00
5	267	**Станок токарно-винторезный 1К625**	**2 700,00**	135,00	90,00

Условия самовывоза и демонтажа	Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводятся за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона
Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Михаил, тел. +375 29-256-64-88

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 **16.11.2020** заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 выше указанного закона.
Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.
Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

Срок подписания договора купли-продажи	**5 (пять)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение (см. выше) и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в ЕГРСоБ и в газете «Звязда» 14.07.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 18.11.2020 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 30.10.2020 по 16.11.2020 до 17.00** по указанному адресу

Тел.: +375 17 280-36-37; +375 44-704-92-06.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества ООО «Геополимер», объявляет о проведении 01.12.2020 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

Предмет торгов:
Лот 1. **Автомобиль грузовой вагон PEUGEOT EXPERT,** 2010 г. в., регистр. знак АР 5896-7, цвет – белый, кузов № VF3XURHRHAZ027372. Начальная стоимость: 11 600,00 бел. руб. без НДС.

Размер задатка: 10 % от начальной стоимости имущества, в размере 1 160,00 бел. руб.

Шаг аукциона: 5 % от начальной стоимости имущества, в размере 580,00 бел. руб.

Лот 2. **Автомобиль грузовой вагон PEUGEOT PARTNER** 2012 г. в., регистр. знак АО 7825-7, цвет – черный, кузов № VF37CNFRCCJ628557. Начальная стоимость: 7 500,00 бел. руб. без НДС.

Размер задатка: 10 % от начальной стоимости имущества в размере 750,00 бел. руб.

Шаг аукциона: 5 % от начальной стоимости имущества в размере 375,00 бел. руб.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ООО «Геополимер».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **10 %** от начальной стоимости лота не позднее **30.11.2020 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 28.10.20** по **17.00 30.11.20** на **bankrottorg.by.**

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: аукционный сбор – 7 % от конечной цены предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение тридцати рабочих дней со дня проведения аукциона.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении вторых повторных публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества дирекции строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича»

Дата и время проведения: **11.11.2020, 11.00.**
Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться **с 09.00 30.10.2020 до 16.00 10.11.2020.**

Предмет торгов –

СТЕЛЛАЖИ МЕТАЛЛИЧЕСКИЕ 300/280/75 в кол-ве 53 секций

Начальная цена – 5253,73 руб. Шаг аукциона – 262,69 руб. Размер задатка – 520,00 руб.

Продавец: Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», тел. +375291070012.

Организатор торгов: ООО «Консалтинговый центр МБА» 220048, г. Минск, ул. Мясникова, 39-331, +375291070012 .

Место проведения: г. Минск, ул. Мясникова, 39, комн. 331. Ранее опубликованное извещение – **torgi.gov.by.**

Место нахождения предмета торгов: Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, 13, восточнее д. Богатырь.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок, заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет продавца Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича» 211162, г. Новолукомль, Витебская обл., р/с BY 74 BAPB 30 12 2104 1001 2000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 211 г. Новолукомль BIC BAPBBY2X, УНП 300015840, ОКПО 03423474, с отметкой банка, копию Устава, свидетельства о госрегистрации. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 10 рабочих дней со дня их проведения.

Ознакомиться с предметами торгов и условиями проведения аукциона можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375291070012.

По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.

С победителем торгов продавцом в срок не позднее 5 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги не позднее 5 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи. Кроме стоимости предмета торгов, победителем аукциона оплачиваются расходы по организации торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть продан этому участнику по цене, превышающей начальную, на 5 %.

В **суд Щучинского района Гродненской области** поступило заявление Сельхановича Генриха Генриковича об объявлении умершей СЕЛЬХАНОВИЧ Янины Иосифовны, 15 мая 1938 года рождения, уроженки д. Оздобичи Щучинского района Гродненской области, зарегистрированной по адресу: г. Щучин, ул. Победы, 10 (д. Резы Рожанковского сельсовета Щучинского района Гродненской области, ул. Победы, 10), проживавшей в аг. Каменка Щучинского района, ул. Школьная, дом 41, кв. 2, убывшей 25.06.2017 г. в г. Гродно. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Сельханович Я. И. сообщить об этом суду Щучинского района Гродненской области в течение двух месяцев со дня опубликования данного объявления.

В **суд Столинского района Брестской области** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим РОКАЛО Ивана Николаевича 10 января 1977 года рождения, уроженца д. Глинка Столинского района Брестской области, последнее известное место пребывания – Брестская обл., г. Столин, пер. Крупской, д. 6, кв. 3.

Просьба к гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Рокало И. Н., в течение двух месяцев с момента публикации сообщить их суду Столинского района (г. Столин, ул. Советская, д. 98, тел. 2-36-65).

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

30 кастрычніка 2020 г. № 41 (577)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЭКСПЕРТНАЯ ПЛЯЦОЎКА

У ПОШУКУ АПТЫМАЛЬНЫХ РАШЭННЯЎ

Гарачая дыскусія разгарнулася ў Мінску на дыялогавай пляцоўцы ў гарадской ратушы падчас абмеркавання работы мясцовага кіравання і самакіравання.

Фота «Мінск-Навіны».

Рэальнасць патрабуе

Мадэратарам дыскусіі выступіў **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ.** Ён назваў сімвалічным той факт, што эксперты, а гэта былі прадстаўнікі парламента, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, палітычных партый, навукі і адукацыі, сабраліся за круглым сталом у знакавым для мінчан месцы — гістарычным будынку сталічнай ратушы, якая з'яўляецца сімвалам гарадскога самакіравання.

Андрэй Бугроў нагадаў, што згодна з артыкулам 117 Канстытуцыі Беларусі мясцовае кіраванне і самакіраванне ажыццяўляюцца грамадзянамі праз мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, мясцовыя рэферэндумы, сходы, іншыя формы прамога ўдзелу ў дзяржаўных і грамадскіх справах.

На яго думку, сёння рэальнасць патрабуе новых рашэнняў у гэтай сферы.

Таму ён папрасіў экспертаў выказацца аб тым, якія змены, папраўкі і ўдакладненні трэба ўнесці ў Канстытуцыю, у дзеючае заканадаўства, каб мясцовае кіраванне і самакіраванне былі самадастатковыя, моцныя, эфектыўныя і адпавядалі патрабаванням часу.

стар. 2

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

Вада, транспарт, суседзі...

Што хвалюе жыхароў Прыдзвіння?

Трыццаць чалавек патэлефанавалі ў мінулую пятніцу на прамую лінію старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміру ЦЯРЭНЦЬЕВУ. Некаторыя пытанні — напрыклад, ацяпленне жылля — адразу былі перададзеныя камунальнікам для як мага хутчэйшага зняцця праблемы.

Шмат званкоў было з Віцебска. У прыватнасці, гараджанка паскардзілася, што перыядычна вымушана скідвацца з калегамі на таксі, каб даехаць на работу на абутковае прадпрыемства, якое знаходзіцца на праспекце Люднікава. Або трэба шукаць іншыя транспартныя варыянты, каб не спазніцца на першую змену, якая пачынаецца ў 6.35 раніцы. Жыве яна на вуліцы Петруся Броўкі. Раней на работу своечасова дабіралася на трамваі. Але з-за таго, што пачалася рэканструкцыя суседняй з прадпрыемствам вуліцы Гагарына, трамвай больш туды не ходзіць. Уладзімір Цярэнцьеў паабяцаў, што праблема будзе дэталёва вывучана. Безумоўна, улада абавязана паклапаціцца пра тых, у каго з-за змянення ў транспартных маршрутах з'явіліся праблемы.

Рэканструкцыя вуліцы Гагарына ў Віцебску.

Дарэчы, з вуліцы Гагарына і тых, што «выходзяць» на яе, тэлефанавалі некалькі разоў.

Мужчына, напрыклад, паведаміў: каб вазіць бабулю, інваліда першай групы, ён пакідае «колы» каля пад'езда дома. Але ДАІ за гэта штрафуе. Дэпутат паабяцаў выехаць на месца разам з прадстаўніком аўтаінспекцыі. І паралельна асабіста вырашыў азнаёміцца з тым, што адбываецца на вуліцы, дзе ў выніку маштабнай рэканструкцыі прапускная здольнасць павінна павялічыцца ў два разы. Гэта магістраль горада, якая вядзе на ўскраіну, ужо летам наступнага года будзе адпавядаць сучасным стандартам: у пытаннях бяспекі, асвятлення, азеляннення. Пры гэтым, безумоўна, трэба, каб і ў дварах было ўтульна, у дамах камфортна, каб людзі разумелі, што праблему кожнага вывучаць і ўлічаць падчас будаўнічых работ. Або вырашаць нешта ў перспектыве.

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

У Сяргея Сіўца новая пасада

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ абраны намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў СНД па прававых пытаннях. Такое рашэнне прынята падчас пасяджэння гэтай камісіі, якая прайшла ў рэжыме відэаканферэнцыі.

Па словах сенатара, прадстаўнікі Беларусі ўнеслі шэраг прапаноў да палажэння аб пастаянных камісіях Міжпарламенцкай Асамблеі. Сяргей Сівец адзначыў, што ўдзел груп міжнародных назіральнікаў ад МПА СНД у маніторынгу выбараў — вельмі важны кірунак дзейнасці Асамблеі, які актыўна падтрымліваецца Беларуссю. На яго погляд, трэба правесці экспертызу дакументаў, якія рэгламентуюць работу дзеючага на пляцоўцы МПА СНД інстытута маніторынгу, вывучыць прапанову Асамблеі аб стварэнні навукова-кансультатыўнага савета.

А шчасце побач

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег РУМО выступіў з лекцыяй па гісторыі транспланталогіі для студэнтаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Сенатар падрабязна апісаў этапы развіцця гэтага кірунку ў Беларусі і планы калег на найбліжэйшую перспектыву. Ён падкрэсліў, што сучасная транспланталогія — гэта ў абсалютнай большасці выпадкаў шанц на працяг жыцця для чалавека, які праз тыя ці іншыя абставіны трапіў пад удар. І калі ёсць спосаб перамагчы цяжкую хваробу, яго трэба выкарыстоўваць, таму што няма большай радасці для доктара, чым здаровы пацыент. Плюс — значны эканамічны эфект і прэстыж краіны ў цэлым.

Пасля лекцыі Алег Румо адказаў на пытанні студэнтаў. У ходзе размовы, у прыватнасці, ён адзначыў: калі вы ўкладзяце ў сваю справу ўсю душу, будзеце шчаслівымі людзьмі.

Для зручнасці насельніцтва

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ прыняла ўдзел у пасяджэннях адміністрацый Савецкага і Партызанскага раёнаў Мінска.

У Савецкім раёне сенатар звярнула ўвагу на недапушчальнасць фарміравання запазычанасці па заработнай плаце ў арганізацыях усіх форм уласнасці. Былі абмеркаваны прычыны ўзнікнення такой запазычанасці. Таццяна Рунец падкрэсліла неабходнасць актывізаваць работу з аб'ектамі нерухомасці, якія выведзены з эканамічнага абароту або неэфектыўна выкарыстоўваюцца.

У Партызанскім раёне абмяркоўваліся пытанні фарміравання складскіх запасаў гатовай прадукцыі і стратных прадпрыемстваў, сітуацыя і перспектывы работы асобных аб'ектаў рознічнага гандлю, напрыклад, латкоў з плодаагароднінай прадукцыяй. На думку сенатара, варта захаваць такія аб'екты для зручнасці насельніцтва.

З газам жыць весялей

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, генеральны дырэктар дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз» Аляксей КУШНАРЭНКА прыняў удзел у цырымоніі ўрачыстага пуску прыроднага газу ў аграгарадку Іскра Бялыніцкага раёна.

Там работнікі газавай службы за тры месяцы пабудавалі амаль 14 км газаправода, што дазволіла падвесці газ у аграгарадкі Іскра і Ланькаў.

Падчас цырымоніі сенатар адзначыў, што газіфікацыя жылля павышае ўзровень камфортнасці жыцця ў вёсцы і спрыяе сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёнаў. Ён нагадаў, што газіфікацыя сельскай мясцовасці праводзіцца пры істотнай падтрымцы дзяржавы.

У ПОШУКУ АПТЫМАЛЬНЫХ РАШЭННЯЎ

Змены праз 15 гадоў?

Першай узяла слова **кандыдат эканамічных навук, загадчык аддзела Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Таццяна ВЯРЦІНСКАЯ.** Яна агучыла думкі, ідэі і прапановы сваіх калег, якія даўно засяроджаны на праблематыцы мясцовага кіравання і самакіравання. Канцэпцыю яго рэфармавання там пачалі распрацоўваць яшчэ ў 2003 годзе. Але яна не была прынята. Прычына — негатоўнасць грамадства да сур'ёзных змен у гэтай сферы, ды і прыярытэты рэгіянальнага развіцця тады былі іншыя. Але зараз час надышоў. Такім чынам, Таццяна Вярцінская выказала калектыўны погляд на пытанні, якія абмяркоўваліся. Яго сутнасць у тым, што сёння патрэбны радыкальныя змены, бо існуючая сістэма мясцовага кіравання і самакіравання — гэта дзяржаўная сістэма. Яна была апраўдана ў краіне з планавай эканомікай. У рынкавых умовах такая сістэма дае збоі. Бо немагчыма «з цэнтра» ўсім кіраваць, усё бачыць і хутка рэагаваць на новыя праблемы ў рэгіёнах. Акрамя таго, вырас і адукацыйны ўзровень мясцовага насельніцтва, іх запыты і патрабаванні да ўлад, асабліва ў моладзі. Яе патэнцыял застаецца шмат у чым нерэалізаваны. А каму, як не ўладам, накіроўваць яго ў патрэбнае рэчышча? Таму дзяржаўная сістэма рэгіянальнага кіравання на постсавецкай прасторы мала дзе захавалася. За мяжой, у той жа Расіі, цяпер дзейнічае грамадская сістэма мясцовага кіравання і самакіравання.

Аднак, папярэдзіла прамоўца, працэс змен будзе і складаны, і даволі працяглы па часе — прыкладна 15 гадоў. І пачынаць такую рэформу лепш ва ўмовах стабільнай эканомікі. Рэформе ў сістэме мясцовага самакіравання павінен папярэднічаць вельмі сур'ёзны падрыхтоўчы этап, які ўключае ў сябе работу ў заканадаўчай, палітычнай і ідэалагічнай сферах. Напрыклад, даўно настаў час ліквідаваць дубліраванне функцый органаў мясцовага кіравання і самакіравання, узмацніць іх фінансавую базу. Таксама варта сінхранізаваць з рэформамі адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне краіны і рэгіёнаў.

У Канстытуцыі трэба дакладна прапісаць прававы статус мясцовага самакіравання і выканаўчых органаў, бо гэта створыць акно магчымасцяў для далейшага

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

ўдасканалення іх дзейнасці. Наогул мясцовае самакіраванне не павінна ўваходзіць у сістэму дзяржаўнай улады.

Кадры, фінансы, кампетэнцыі

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Віктар ЧАЙЧЫЦ не згодны чакаць 15 гадоў. Паводле яго слоў, гэта занадта працяглы тэрмін, можна і трэба хутчэй справіцца з пастаўленай жыццём задачай рэфармавання сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання. Улічваючы актыўнасць грамадзян, наяўнасць цікавага замежнага досведу, для гэтага ёсць усе шанцы. Па першым часе неабходна даць больш кампетэнцый органам мясцовага самакіравання, умацаваць іх кваліфікаванымі кадрамі, дапамагчы з напаўненнем бюджэту.

Сёння, лічыць сенатар, вельмі важна сабраць і прааналізаваць усе слушныя прапановы людзей наконт удасканалення мясцовага кіравання і самакіравання. Але не трэба чакаць, што гэта ў большасці сваёй будуць юрыдычна вывераныя прапановы. Інакш нас спасцігне моцнае расчараванне. Нямала людзей хочуць, каб з пераменамі да лепшага было, як у папулярнай тэлеперадачы: на два-тры тыдні з'ехалі з кватэры ці дачы, вярнуліся — а там усё прыгожа і зэзе, усё па-новаму і ўтульна. У жыцці так не бывае.

Разлічваць на паэтапнае рэфармаванне сістэмы мясцовага кіравання не зусім правільна. Сёння такі імклівы час, такія тэхналогіі, што многае можна зрабіць значна хутчэй, мяркуе Віктар Чайчыц.

Час нестандартных ініцыятыў

У ходзе размовы былі выказаны розныя ідэі і прапановы. Закранулі эксперты і тэму скасавання сельскіх Саветаў, якая перыядычна ўзнікае ў экспертнай супольнасці і сярод прадстаўнікоў вертыкалі. Як вядома, старшыні сельскіх Саветаў з'яўляюцца адначасова і старшынямі сельскіх выканкамаў. Іх штат — тры чалавекі, бюджэт — мізэрны. Можна на месцах арганізаваць сельскія адміністрацыі замест слабых сельскіх Саветаў і выканкамаў, актыўна павышаць ролю сельскіх старастаў у вёсках.

Гучалі і пакуль незвычайныя для нашага ўспрымання прапановы. **Старшыня Беларускай партыі «Зялёныя» Дзмітрый КУЧУК** выказаў думку пра неабходнасць даць права мясцовым жыхарам ствараць свой тэрытарыяльны самакіравальны калектыў — Грамаду з пэўнымі паўнамоцтвамі. У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем гэтыя самакіравальныя калектывы могуць выступаць, на думку прамоўцы, у двух відах: замест раёна павятовая Грамада (ці павет) і абласная Грамада (вобласць). Яны, зазначыла, не ўваходзяць у сістэму органаў дзяржавы, але самі ствараюць выканаўчыя органы ўлады — управы. Карацей, такія вось радыкальныя змены.

Моцныя спрэчкі разгарнуліся вакол надання новага імпульсу калегіяльным органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КОТГСам), удзелу ў іх рабоце ініцыятыўнай, неабыякавай моладзі. Гаварылі і аб пашырэнні правоў і паўнамоцтваў гэтых органаў, аб новых падыходах да фінансавання, аб удзеле ў арганізацыі розных мерапрыемстваў: ад свята двара ці вуліцы, конкурсу на самы прыгожы кветнік, найлепшую дзіцячую пляцоўку да супрацоўніцтва з адміністрацыяй раёна і яе структурамі, напрыклад сацыяльнай службай, жыллёва-камунальнай гаспадаркай. Зайшла размова і пра магчымае ўкараненне элементаў электроннага самакіравання на ўзор «электроннага ўрада».

І замежны досвед?

Многія эксперты выступалі за больш смелае і шырокае ўкараненне здабыткаў замежных калег у паўсядзённую практыку работы беларускіх структур мясцовага кіравання і самакіравання. На карысць гэтага выказаўся і Андрэй Бугроў, які заклікаў не займацца вынаходніцтвам ровара, а браць найлепшае ў суседзяў. Напрыклад, у Расіі, дзе істотна прасунуліся наперад у развіцці інстытута мясцовага самакіравання. Аднак, на погляд старшыні Мінскага гарсавета, трэба быць абачлівымі ў гэтай справе. Бо Еўропа да цяперашняй сістэмы мясцовага самакіравання ішла стагоддзямі, шляхам спроб і памылак. Механічны перанос на нашу глебу еўрапейскага досведу можна не спрацаваць, не даць чаканы эфект.

Тым не менш, запэўніў прысутных Андрэй Бугроў, усе прапановы экспертаў будуць вывучаны, прааналізаваны і ўлічаны ў рабоце заканадаўцаў.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Фота «Мінск-Навіны».

Вада, транспарт, суседзі...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Віцяблянка-пенсіянерка агучыла праблему, якая ва ўсіх на слыху: другая хваля каранавіруса. «Чаму народ ходзіць у крамы і аптэкі без масак?» — эмацыянальна падзялілася перажываннямі. Маўляў, трэба ўсіх прымусіць! «Але гэта будзе незаконна, так можна выклікаць агульную незадаволенасць», — адказаў дэпутат. Кожны, хто беражэ сябе і тых, хто побач, безумоўна, карыстаецца маскай і пальчаткамі ў грамадскіх месцах. Персанал крам, аптэк і гэтак далей адназначна абавязаны насіць сродкі аховы. А людзям састарэлага ўзросту не рэкамендуецца лішні раз выходзіць з дому. Пры гэтым з кватэры па тэлефоне можна заказаць прадукты з дастаўкай. Усё больш пенсіянераў могуць праз інтэрнэт аплачваць камунальныя паслугі...

Жыхар Оршы, які жыве на праспекце Тэкстыльшчыкаў, паскардзіўся, што вада з крана

цячэ няякасная. Сказаў, што адказныя асобы, з якімі гаварыў аб гэтым, канстатавалі: вясной будзе зроблены праект тэхнічнага вырашэння праблемы. Падкрэсліў, што нават агучыў праблему ў Міністэрстве ЖКГ. Але да сённяшняга дня нічога не змянілася. Пытанне, па словах Уладзіміра Цярэнцьева, пастараюцца вырашыць станоўча, не адкладваючы ў доўгую скрыню.

Пенсіянеры з гэтага ж райцэнтра не могуць спакойна жыць з-за праблемных суседзяў, якія злоўжываюць спіртным, па начах не даюць спаць. Канешне, хадзілі скардзіцца па інстанцыях, ды гэта так і не дапамагло. Уладзімір Цярэнцьеў супакоіў заяўніка і адразу патэлефанаваў у Оршу. Безумоўна, міліцыя ў такім выпадку павінна больш пільна кантраляваць паводзіны людзей, якія не даюць нармальна жыць іншым. Адназначна ўвага да іх будзе як «пад мікраскопам».

Жанчына з вёскі Багатырская Полацкага раёна прасіла дапамагчы з асфальтаваннем. Яшчэ тры гады таму звярталася з праблемай да мясцовай улады, але нічога не змянілася.

Жыхарка гарадскога пасёлка Езярышча Гарадоцкага раёна не можа атрымаць інфармацыю наконт таго, куды тэлефанаваць, калі, напрыклад, знікла электраасвятленне на вуліцы. Прасіла дапамагчы надрукаваць даведнік з нумарамі тэлефонаў. Прысутны на прамой лініі прадстаўнік ЖКГ параіў па любых камунальных пытаннях тэлефанаваць па нумары 115. Дарэчы, даручана больш актыўна рэкламаваць гэты нумар у СМІ, бо многія яшчэ не ведаюць, што менавіта ў гэтую «дыспетчарскую» трэба паведамляць пра камунальныя цяжкасці.

Грамадзяне не толькі прасілі дапамагчы, але і дзякавалі кіраўніку абласнога парламента Савета дэпутатаў за дапамогу падчас мінулых зваротаў, у прыватнасці наконт пытання добраўпарадкавання ў Віцебску. Людзі заўважылі, што Уладзімір Цярэнцьеў стараецца сам вырашаць праблему, перад гэтым часта ўдакладняючы нюансы з заяўнікамі яшчэ раз, выязджае на месцы, дзе неабходна нешта зрабіць...

Каментуючы звароты, старшыня аблсавета канстатаваў, што на традыцыі большасць скаргаў датычыцца праблем ЖКГ, большасць сігналаў — з абласнога цэнтра. Калі людзі так актыўна тэлефануюць дэпутату нават па дробных пытаннях, значыць, ёсць давер, і гэта прыемна і адказна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ,
фота аўтара.

ЭПОХА І ПАКАЛЕННІ

У эфіры тэлеканала «Культура» на наступным тыдні пакажуць мастацкі фільм, зняты па матывах твораў Міхаіла Булгакава. А таксама зможам убачыць міжнародны этнічны фестываль «Музыка нашых сэрцаў».

Кінастужка «Бег» (па творах класіка «Бег», «Белая гвардыя» і «Чорнае мора») — гэта першая экранізацыя твораў пісьменніка ў СССР і ў свеце, якая сёлета святкуе 50-годдзе. Фільм, зняты рэжысёрам Аляксандрам Алавым, пераносіць гледачоў у 1920-ы, які стаў апошнім годам грамадзянскай вайны ў Крыме. Белыя палкі і тысячы бежанцаў пакінулі радзіму з надзеяй пачаць новае жыццё за мяжой. Аднак эмігранцкае жыццё аказваецца не ўсім па сілах... Не прапусціце паказ 4 лістапада ў сераду (1-я серыя) і 6 лістапада ў пятніцу (2-я серыя).

А ў суботу, 7 лістапада, аўдыторыю запрашаюць даведацца пра традыцыі і культуру розных краін, прадстаўнікі якіх збяруцца на Міжнародным этнічным фестывалі «Музыка нашых сэрцаў». Пачуем выступленні музычных калектываў з Беларусі, Арменіі, Сербіі, Ізраіля, Татарстана, Расіі, сярод якіх Кубанскі казачы хор, «Беларускія песняры», Іштар Алабіна і многія іншыя артысты.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 106

Наступную задачу ***(гл. дыяграму)*** склаў знакаміты эстонскі гросмайстар, шматгадовы прэтэндэнт на званне чэмпіёна свету Пауль Керас (1916—1975), які захапляўся і шахматнай кампазіцыяй.



Белыя: Крe7, Лb5, Лb7, пп. b4, c4 (5).

Чорныя: Крc6, Ка8 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Сёлетнія чэмпіянаты Беларусі ў вышэйшай лізе сярод мужчын і жанчын з шэрагу прычын аказаліся нешматлюдныя. Перамаглі Міхаіл Нікіценка і Ксенія Зелянцова. Пра ход і вынікі спартыўнай барацьбы мы раскажам у наступным выпуску.

* * *

Па-ранейшаму беларускія шахматысты выступаюць у анлайн-спаборніцтвах. На сайце chess.com у бліц-турніры (674 удзельнікі) Сяргей Жыгалка фінішаваў на 12-м месцы, Уладзіслаў Кавалёў — на 20-м. У другім турніры на тым жа сайце (428 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік заняў 33-е месца, Уладзіслаў Кавалёў — 37-е, а яшчэ ў адным турніры (641 удзельнік) Д. Лазавік быў дванаццаты, Сяргей Жыгалка — сямнаццаты.

Дзве наступныя партыі — таксама з анлайн-турніру, сёлетняга спаборніцтва вядучых шахматыстаў свету «Легенды шахмат».

Адзін усё жыццё ўладкоўвае сваю кватэру, свой дом, сваю сядзібу. Значыць, гаспадар-чалавек, клапоціцца, каб добры след на зямлі пасля сябе пакінуць. А другі не толькі для сябе, але і для грамады, для вёскі альбо вуліцы добрую справу робіць. Такога навакольныя асабліва цэняць. Ну вось, напрыклад, як Барыса Габца ў маленькай вёсцы Манцы Пружанскага раёна.

У тых Манцах стала пражываюць усяго дзве жанчыны — Валянціна Манцэвіч і Вольга Грыцук, ну яшчэ дваты дачнікі заязджаюць. Дык вось адзін з іх, Барыс Габец, і зрабіў свой пасільны ўнёсак у добраўпарадкаванне маляўнічай пушчанскай вёскі. Узвёў на ўездзе драўляны крыж, дыхтоўны, такі, як некалі ставілі пушчанцы, каб абазначыць свой населены пункт. Крыж тут асабліва дапасуецца да аркі, якую ўтваралюць старыя дрэвы.

Барыс Васілевіч працуе ў Шарашэўскім лясніцтве Нацыянальнага парку. Вырас у суседнім Шарашэве. А ў Манцах купіў старую хаціну. Побач узвёў дачны дом для сваёй сям'і. На жаль, не давялося сустрэцца з ім — у дзень майго прыезду ён знаходзіўся ў далёкім лясным квартале. А па тэлефоне сказаў, што прывабілі ў Манцах яго найперш векавыя дубы, якіх тут многа, і незвычайная энергетыка мясціны, якую гэтыя дубы, хутчэй за ўсё, і ствараюць. Яшчэ параіў пісаць пра старажылаў, якія шмат ведаюць.


Вольга ГРЫЦУК каля векавога дуба.

Драўляны крыж на ўездзе ў вёску.

Адна з іх, Вольга Грыцук з вялікай павагай адазвалася пра суседа. Сказала, што менавіта Барыс не даў спілаваць 200-гадовы дуб, які расце на яе падворку. Вольга Максімаўна ўжо і брыгаду выклікала, каб знесці дрэва. Ды малады сусед усё ж угаварыў жанчыну пакінуць дуб, які пасадзіў яшчэ прадзед яе гаспадара. Дрэва ж перажыло не адну вайну, якія пракаціліся па нашай зямлі, выстаяла. «Добра, што людзі з горада пацягнуліся да вёскі, — гаворыць 88-гадовая Вольга Грыцук. — Бо што было б? Пасля нас хоць шыльду з назвай населенага пункта здымай. А так не толькі шыльда, але і крыж стаіць, значыць, жывуць людзі, жыццё працягваецца».

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.

Пружанскі раён.

МАЛАЯ РАДЗІМА

Як пачысціць вадаём? Талакой!

Вёска Валодзькі Маладзечанскага раёна летась адзначыла 425-годдзе. Сёння тут набярэцца не больш за дзясятак дамоў карэнных жыхароў. Аднак новае пакаленне — гараджане — прыстасавала спадчыну пад лецішчы, а то і зусім вярнулася жыць у родныя мясціны. Людзі з'ядналіся і многае робяць для таго, каб іх вёска квітнела.

Старажылы з сумам успамінаюць, што раней Валодзькі былі цэнтральнай сядзібай адпаведнага сельсавета. Тут месціліся клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, крама. Жыццё віравала! Па беларускай звычцы людзі ўмелі добра працаваць і гэтак жа адпачываць.

> Часам выйду раніцай на ганак дома і, здаецца, гатовая заплакаць ад замілавання: якое навокал хараство, якое ўсё роднае і якая я шчаслівая, што нарадзілася менавіта тут.

Цяпер тут толькі жылыя дамы. І хоць прыкладна палова з іх выкарыстоўваецца як лецішчы, але ў асноўным мясцовымі — тымі, хто атрымаў іх у спадчыну. Большасць цяперашніх жыхароў памятае традыцыі сваіх продкаў. Не дзіўна, што некалькі гадоў таму Ала Юрынок, у той час стараста, пачала праводзіць свята вёскі, Купалле. Ёй прыйшлося і сцэнарыі пісаць, і ўсялякія


Было...

...стала

арганізацыйныя пытанні вырашаць. Нагрузка вялікая, але жанчына не шкадуе — усе жыхары перазнаёміліся і падтрымліваюць добрыя стасункі. А пра святы нават фільмы здымаюць, а потым на пачатку сезона ладзяць калектыўны прагляд.

— Зусім недалёка ад вёскі знакамітая рэчка Чарняўка, але ёсць у нас і свой вадаём. Я памятаю, як яго талакой капалі нашы бацькі. А падаў такую ідэю наш паважаны Віктар Якаўлевіч Жартун. Свой вадаём вёсцы быў патрэбен найперш па тэхніцы бяспекі. Акрамя таго, тады і ў калгасе, і ў гаспадароў было шмат хатняй жывёлы — трэба ж было яе напаіць. Ну, а для дзяцей зусім раздолле — можна купацца. Вадзілася там калісьці і рыба, — расказвае Ала Вікенцьеўна. — А ў гэтым годзе неяк раптам заўважыла, што вадаём зацягнула цінай. Як так — думаю, і непрыгожа, і купацца нельга. Пайшла па дамах і папыталася ў суседзяў, ці гатовыя яны выйсці на чыстку вадаёма. Ніводная сям'я не адмовілася! Актыўны ўдзел прымалі Людміла і Міхаіл Канановічы, дзеці Івана Якімавіча Несцера, які некалі на трактары выкопваў вадаём, а таксама нашы школьнікі Максім Шэўнік і Дзяніс Янко. Талакой, як калісьці нашы бацькі, і мы справіліся. Стала вельмі прыгожа. Адразу ж з'явілася ідэя: трэба правесці зарыбленне. І зноўку грошы збіралі ўсёй вёскай — хто колькі можа. Мой сын Аляксей з сябрам Анатолем Шэўнікам ужо з'ездзілі ў рыбгас, даведаліся, што, як і калі трэба рабіць. Хутка ў нашым вадаёме будуць жыць белы амур і таўсталобік. Яшчэ ёсць ідэя зрабіць побач добрую дзіцячую пляцоўку. Шмат хто з бацькоў яе падтрымлівае, таму ўпэўнена, што ўсё ў нас атрымаецца.

Каб увесь час быць на сувязі, пастаянныя жыхары Валодзькаў і дачнікі стварылі групу ў «Вайберы». Ала Юрынок, як яна сама кажа, проста неабыякавая і актыўная жыхарка. Зрэшты, з новым старастам жанчына ў добрым кантакце — летась усе святы разам ладзілі.

— З розных прычын людзі вяртаюцца ў бацькоўскія хаты, — кажа Ала Вікенцьеўна. — Калі жыла ў Мінску, душа рвалася сюды. Цяпер працую ў Радашковічах, а да таго гадоў дзесяць ездзіла ў сталіцу. Час у дарозе не марнавала, нават сшыткі правярала.

У нас тут дзівосныя краявіды, вельмі прыгожая прырода. У вёсцы ёсць аграсядзіба. Сёлета там адпачывала нямала людзей, якія раней праводзілі вольны час за мяжой. Дык вось яны са здзіўленнем адкрывалі сваю краіну. У паўсядзённым жыцці мы не заўсёды заўважаем прыгожыя пейзажы, якія мільгаюць за акном аўтамабіля, а ў адпачынку зрок абвастраецца. Я і сама часам выйду раніцай на ганак дома і, здаецца, гатовая заплакаць ад замілавання: якое навокал хараство, якое ўсё роднае і якая я шчаслівая, што нарадзілася менавіта тут.

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота з архіва Алы ЮРЫНОК.

У брэсцкім мікрараёне Кавалёва праводзіцца эксперымент па ўкараненні новай формы збору бытавых адходаў

ПЕРАМЕНЫ ДА ЛЕПШАГА

НА ДЗВЕ ТРЭЦІ ПАД ЗЯМЛЁЙ

Спачатку ў раёне вуліц Луцкай, Валгаградскай, Кастрычніцкай рэвалюцыі з'явіліся будаўнікі, абгарадзілі тэрыторыю і сталі капаць вялікія ямы. Потым устанавілі там загадзя прывезеныя вялікія ёмістасці. Кожная з іх па аб'ёме не меншая за пяць стандартных кантэйнераў.

Яшчэ летам **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** паведаміў, што ў густанаселеным мікрараёне будуць устаноўлены 23 падземныя кантэйнеры. Да пачатку зімы гарадская камунальная гаспадарка абяцала прыступіць да эксперымента. Работа актыўна вядзецца, хутка жыхары дамоў на ўказаных і найбліжэйшых вуліцах пачнуць прывыкаць да новага спосабу збору смецця.

Падземныя, ці, як іх іначай называюць, заглыбленыя, кантэйнеры шырока выкарыстоўваюцца ў краінах Еўропы. Пра гэта расказаў **намеснік дырэктара Брэсцкага смеццеперапрацоўчага завода Сяргей ТАРАСЕВІЧ.** Паводле яго слоў, мікрараён Кавалёва выбраны для старту новай кампаніі, таму што шчыльна забудаваны — транспарту камунальнікаў там цяжка перамяшчацца і лавіраваць. Смеццявозы нярэдка трапляюць у сітуацыю, калі выехаць, размінуцца з транспартам грамадзян бывае складана.

Акрамя таго, побач з паглыбленымі кантэйнерамі будуць устаноўлены скрыні для раздзельнага збору смецця. Гэта значыць, што асобна пачне збірацца шкло, пластык, папера. Як мяркуюць спецыялісты, створаныя ўмовы для раздзельнага збору бытавых адходаў паспрыяюць паступоваму выхаванню культуры гараджан у гэтым пытанні. Да таго ж ёсць абавязак грамадзяніна, замацаваны законам «Аб абыходжанні з адходамі».

І вось ужо пластыкавыя бакі, на дзве трэці заглыбленыя ў зямлю, паявіліся побач з дамамі па вуліцы Луцкай, Валгаградскай, вядзецца іх устаноўка каля дома па вуліцы 28 Ліпеня. На паверхні застаецца трэць кантэйнера, закрытага крышкай. У якасці пераваг спецыялісты называюць эстэтыку: такія кантэйнеры, у адрозненне ад звычайных адкрытых, не псуюць знешні выгляд тэрыторыі, плюс адбываецца эканомія сродкаў: смеццявоз падыдзе да аднаго кантэйнера замест пяці.

Варта сказаць, што падобныя пляцоўкі ёсць у асобных новых мікрараёнах горада, і яны добра сябе зарэкамендавалі. Гаворка ідзе пра падземныя пляцоўкі для збору бытавых адходаў каля дамоў 9—11 па вуліцы Марозава і 27—29 па вуліцы Вароўскага. Кожная «падземка» абслугоўвае да тысячы чалавек. І жыхары шматкватэрных дамоў ацанілі такі еўрапейскі падыход да збору смецця.

Пляцоўкі на ўказаных вуліцах аднолькавыя. Кожная з іх складаецца з трох заглыбленых ёмістасцяў аб'ёмам да трох кубічных метраў. Дзве з іх вызначаны для змешаных адходаў, адна — для шкла. (Для макулатуры і пластыку недалёка ўстаноўлены еўракантэйнеры.) Паколькі над зямлёй выступае толькі верхняя частка кантэйнераў, куды апускаецца пакет, яны не выглядаюць грувасткімі, а эфектыўная сістэма бяспекі не патрабуе агароджы. Такім чынам смецце не можа быць расцягнута жывёламі альбо птушкамі, практычна не адчуваецца непрыемны пах у летнюю спёку. Падобныя пляцоўкі з'явіліся ў выніку міжнароднага супрацоўніцтва Брэста з еўрапейскімі партнёрамі.

Прыйшоў час прымяняць станоўчы вопыт раёнаў новай забудовы і ў старых «спальніках». Гэта значыць, што ў шматпавярховіках раёна Кавалёва неўзабаве будуць завараныя смеццеправоды, а людзі панясуць пакеты са смеццем на вуліцу.

Наталля Шалуха, якая жыве ў доме па вуліцы Валгаградскай, гаворыць, што ноу-хау толькі вітае:

— У маёй сям'і даўно сартуюць смецце — гэта, калі хочаце, абавязак любога цывілізаванага чалавека, а заадно і яго прыкмета. Няма нічога складанага ў тым, каб трымаць побач з традыцыйным вядром для адходаў яшчэ два-тры пакеты, куды трэба складваць паперу, пластык, шкло. Вядома, смеццеправод у доме зручны для жыльцоў. Але, відаць, прыйшла пара ад яго адмовіцца нават па санітарных меркаваннях. Тым больш што асобныя суседзі часам усё ж праяўляюць сваю нявыхаванасць, кідаюць туды габарытныя рэчы і забіваюць праход. А калі чалавек будзе складваць адходы навідавоку, то ён мусіць паводзіць сябе прыстойна. Як бачым, у новай форме збору смецця прысутнічае і пэўны элемент выхавання.

Яшчэ нейкі дзясятак гадоў таму ўсе камунальна-бытавыя адходы Брэста вывозілі на палігон у Маларыцкі раён, за 40 кіламетраў ад абласнога цэнтра. У 2010-м быў узведзены смеццеперапрацоўчы завод, і сітуацыя, найперш у экалагічным плане, стала кардынальна мяняцца. Цяперашняя кампанія ў мікрараёне Кавалёва — працяг гэтых пазітыўных перамен.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 29 кастрычніка 2020 года.

СНЕЖНАЯ КАРАЛЕВА

Што будзем насіць, калі выпадзе снег?

Зіма 2020/2021 працягвае настальгіраваць па 70-х гадах мінулага стагоддзя. Вядучыя дызайнерскія дамы прапануюць насіць джынсы-клёш, спадніцы з какеткай, дублёнкі і грубыя чаравікі. Таксама мадэльераў, відавочна, натхняюць стылістыка фільма «Матрыца» і творчая перапрацоўка стыляў «готыка» і «панк».

А што канкрэтна?

З улікам вышэйсказанага цалкам чакана, што гэтай зімой нам прапануюць апранацца ў чорную скуру. Дакладней, у экаскуру, бо натуральнае скураное адзенне — гэта дорага і не «эка-фрэндлі». Ухваляюцца курткі, спадніцы, сукенкі, штаны і нават кашулі з экаскуры. Уласна кажучы, колеры скуранога адзення могуць быць любыя, але найбольш актуальны — менавіта чорны. Калі гэта зусім не спалучаецца з вашым бачаннем прыгажосці, дадайце ў гардэроб хоць бы адну такую рэч. Прасцей за ўсё — спадніцу або штаны: з імі можна скласці вобразы і для офіса, і для выхаду ў свет.

Экаскуру мадэльеры спалучаюць і з іншымі матэрыяламі: напрыклад, актуальныя будуць джэмперы і спадніцы са скуранымі ўстаўкамі. Але гэта, як той казаў, на аматара.

Калі вы плануеце правесці гэтую зіму не вылазячы з-пад коўдры, то вам пашанцавала: вы будзеце самыя стыльныя. У сезоне 2020/2021 на грэбні моднай хвалі будуць дутыя *пухавікі-аверсайз* без лішняга дэкору, падобныя на коўдры. А таксама сцёганыя рэчы — спадніцы, сукенкі і камізэлькі. Падыдуць яны далёка не ўсім, бо дадаюць аб'ём, так што прымярайце і ацэньвайце сябе ў люстэрку крытычна.

«Бабуліна» мода будзе актуальная як ніколі — мяккія і ўтульныя махеравыя світары стануць трэндам гэтай зімы. Прычым любыя: з круглым або V-падобным выразам, з высокай гарлавінай а-ля вадалазка. Такі світар у гэтым сезоне будзе актуальна надзяваць на кашулю.

Зімовую шэрасць мадэльеры не першы сезон спрабуюць «размаляваць» яркімі фарбамі (у свежых зімовых калекцыях можна сустрэць ярка-жоўты, фіялетавы, ліловы, ружовы, колер марской хвалі, зялёны, аранжавы і колер перцу чылі). На нашых прасторах, аднак, гэты трэнд не прыжываецца. Ну што ж, тады для вас — «новы чорны» гэтай зімы: карычневы ва ўсіх адценнях. Яшчэ актуальныя цёмна-бардовы і крэмавы.

Звяры ў гэтым сезоне зноў у бяспецы: *штучнае футра* па-ранейшаму ў модзе, натуральнае — і ў гэтым сезоне маветон. Гэта могуць быць футэркі або вопратка са штучнага футра, футровыя курткі і нават абутак з футровым аздабленнем. Галоўнае правіла: сучаснае экафутра не павінна быць «родам» з вашага дзяцінства ці імітаваць дваровага ката пасля дажджу. У ідэале яно наогул не павінна імітаваць ніякага звера, нават пясца або шанхайскага барса. У гэтым сезоне выбіраем яркія колеры і футэркі з прынтамі — геаметрычным і нават кветкавым. Зрэшты, прынты «зебра» і «леапард», што перавандравалі ў гэтую зіму з мінулай, таксама зробяць футравую рэч яшчэ актуальнай.

У модзе *рэчы з вялікімі плячыма*, а таксама *прасторныя рукавы* («ліхтарыкі» і нават «ліхтары»). З гэтым трэндам трэба абыходзіцца асцярожна, бо такія рукавы дадаюць аб'ём у верхняй частцы цела. Можа быць, каб зрабіць вобраз актуальным, дастаткова будзе акцэнтаваць плечы паланцінам або шалікам. З аб'ёмнымі плячыма ў новых калекцыях можна знайсці джэмперы і *пінжакі ў мужчынскім стылі*. Апошнія вось ужо некалькі сезонаў не выходзяць з моды. У трэндзе застаюцца мадэлі «аверсайз» і сілуэты, звужаныя ў таліі. Лайфхак: зрабіць прамы пінжак прыталеным дапаможа ўмерана шырокі рэмень. Рамяні цяпер надзяваюць на пінжакі, і за гэта ніхто не кіне ў вас камень.

Устойлівае развіццё

Што датычыцца абутку, у надыходзячым зімовым сезоне галоўны элемент дэкору абутку, прадэманстраваны на подыумах, — *ланцугі*. Напрыклад, боты ад Michael Kors, дэкарыраваныя буйным вертыкальна размешчаным ланцугом, афарбаваным у залаты колер. Праўда, трэнд на ланцугі ў якасці ўпрыгожвання абутку, верагодна, дойдзе да нас пазней — можа быць, у канцы зімы. Як і нечаканы прынт *«зебра»* у якасці ўпрыгожвання чаравікоў і ботаў. Гэтай зімой (як і мінулай) у трэндзе *абутак з анімалістычнымі прынтамі*, але на подыумах «зебра» пацясніла традыцыйных «змяю» і «кракадзіла». Яшчэ адзін трэнд — *абутак у клетку*. Да калготак у клетку мы ўжо прывыклі, многія модніцы нават паспрабавалі ўпісаць іх у свае вобразы. А вось моду на батыльёны, боцікі і чаравікі ў клетку нам яшчэ трэба прыняць. Ну або так і не прыняць.

Калі спусціцца з подыумаў на грэшную зямлю, то найбольш актуальныя будуць *боты да калена на абцасе* з шырокім прысабраным галянішчам. Мабыць, гэта самы жаноцкі варыянт з тых, што прапануе модная зіма. Па-ранейшаму актуальныя *батфорты* — на плоскім хаду ці на невялікай танкетцы. Наогул, у гэтым халодным сезоне, як і ў мінулым, заканадаўцы свету моды рэкамендуюць адмовіцца ад высокіх абцасаў на карысць практычнасці і ўстойлівасці. І гэта правільна. *Чаравікі са шнуроўкай* у стылі «кэжуал», «боха», «мілітары» або «гранж» перавандравалі з мінулай зімы ў цяперашнюю. Шнуроўка апрыёры «робіць» практычна любыя чаравікі актуальнымі. У гэтым сезоне яна можа знаходзіцца як наперадзе, так і збоку, і нават ззаду.

Селі на галаву

Памятаеце, як мама загадвала вам у падлеткавым узросце: «Абавязкова надзень шапку!» Гэтай зімой да голасу матчынага патрабавання далучаюцца вядучыя дызайнеры свету. Правільная шапка — не проста «грэлка» для галавы, гэта аксесуар, які робіць амаль кожны вобраз актуальным.

Асабліва калі гаворка ідзе аб капелюшы. У гэтым халодным сезоне капелюшы актуальныя як ніколі. Зразумела, што гэты раскошны аксесуар падыходзіць далёка не кожнай. Але калі ў вас атрымаецца падабраць падыходзячы капялюш адпаведна сваім густу і знешнасці, гэтай зімой вы будзеце лавіць зачараваныя позіркі. Фаварыт дызайнераў — *капялюш Fedora*. Ну, а адважным модніцам можна параіць шыракаполы капялюш. Ён можа быць фетравы або з шарсцяной тканіны — такія галаўныя ўборы прадставіў дом «Шанэль» пры дэманстрацыі калекцыі Ready-To-Wear. Колер выбіраем як класічны чорны, бэжавы або шэры, так і з яркай палітры.

Яшчэ адзін модны галаўны ўбор гэтага зімовага сезона — панамы з фетру, воўны або скуры. Такія панамы і капелюшы клош у розных варыянтах можна было ўбачыць на паказе Christian Dior. Насіць іх мадэльеры Dior прапануюць насунуўшы на вочы, у тандэме з доўгімі паліто. Зрэшты, дэмакратычная панама будзе выдатна спалучацца, напрыклад, і з моднымі сёлетняй зімой дублёнкамі.

Вязаныя шапкі ў гэтым сезоне жывейшыя за ўсіх жывых. Сярод фаварытаў будучай зімы — гарэзлівыя шапкі з пампонамі і мадэлі буйной вязкі. Вязаныя шапкі гэтым разам носім з адваротам, як у дзяцінстве.

Антытрэнды зімы

А цяпер пагаворым аб тым, што насіць НЕ трэба.

✓ Перадусім гэта вопратка з рэменем-гумкай. Напэўна, яна знойдзецца ў шафе ў вельмі многіх дам. Цёпла, зручна і... «эфект вусеня» вам забяспечаны. Не і яшчэ раз не! Выбіраем прамы крой або «аверсайз». А падкрэсліць талію, калі ўжо вельмі хочацца, можна з дапамогай шырокага рэменя.

✓ Футровыя кішэні на вопратцы, як і футровая аблямоўка на рукавах, і футравыя «званочкі», што матляюцца на «завязках» ад капюшона, — усё гэта неактуальна. Асабліва калі вы даўно ўжо выйшлі з узросту малодшай школы.

✓ Кароткія вязаныя сукенкі ў абцяжку. Вязаныя сукенкі якраз актуальныя, але абцягваць формы яны не павінны, якія б прыгожыя тыя ні былі. Будзем больш сціплыя і ўспомнім, што ў жанчыне павінна быць загадка. Выбіраем сукенкі «аверсайз». Сілуэт можа быць прамы або трохі звужаны ў таліі, а даўжыня — да калена або ніжэй калена.

✓ «Дуцікі». Дутыя боты — яшчэ адна любімая нашымі жанчынамі штучка. Зручна, цёпла, але ў такіх ботах ногі здаюцца непрапарцыянальна вялікімі. Не хочаце быць падобнай на хобіта — пакіньце гэты абутак для загарадных прагулак і паездак у вёску. Дарэчы, вышэйсказанае можна аднесці і да угаў.

✓ Боты на шпільцы. Калі абцас, то ўстойлівы і масіўны. А лепш — плоская падэшва. Зіма ўсё ж такі, слізка!

✓ Шапка і шалік з аднаго камплекта. Сумна і неактуальна. Паэксперыментуйце з фактурамі і адценнямі. І не падбірайце сумку да абутку і абутак да сумкі — гэтай бабулінай парады прытрымлівацца не варта.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Беларускія праведнікі

«Хто б ён ні быў — ён чалавек!»

З маленства я чуў расповеды бацькі і яго баявых таварышаў — партызанаў 277-га палка, які базіраваўся на тэрыторыі Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў знакамітых Усакінскіх лясах. Назаўсёды яны засталіся ў маім сэрцы.

Акружэнне, палон, уцёкі...

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, у пачатку чэрвеня 1941 года майго бацьку Мацвея Рыгоравіча Сахрая (правільна Моту Гіршавіча) прызвалі на ваенныя зборы, а 22 чэрвеня пачалася вайна. Бацька расказваў, што яшчэ да нападу нямецкіх войскаў на тэрыторыю СССР яны бачылі нямецкія самалёты-разведчыкі, а пасля прыляцелі бамбардзіроўшчыкі і пачалі бамбіць. Бацькава часць тады знаходзілася на палігоне пад Мінскам. Нехта пачаў страляць па самалёце з вінтоўкі-трохлінейкі. Адзін самалёт задыміўся і пачаў падаць. Праз некалькі хвілін на машыне прыехалі афіцэр і некалькі салдат, спыталі, хто страляў. І чырвонаармейца, які прызнаўся, што гэта ён збіў самалёт, расстралялі за тое, што ён не выкананаў загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага — не падавацца на правакацыі.

«Партызанскі лагер». Мемарыял «Усакіна», Клічаўскі раён.

Вайна пылала на тэрыторыі СССР, Чырвоная Армія адступала. Не хапала зброі, боепрыпасаў, ваеннай тэхнікі і харчавання. У часці, дзе служыў бацька, вінтоўкі былі часоў Першай сусветнай вайны. Санітарныя батальёны і шпіталі не былі падрыхтаваныя да прыёму такой вялікай колькасці параненых. Нямецкія самалёты пастаянна кружылі ў паветры, бамбёжкі не спыняліся ні на хвіліну. Самалёты са свастыкай, што лёталі нізка, стралялі па людзях з кулямётаў.

Часць, у якой служыў бацька, трапіла ў акружэнне. У снежні 1941 года ён разам з іншымі чырвонаармейцамі пасля шматгадзіннага бою, кантужаны, трапіў у палон.

Лагер ваеннапалонных знаходзіўся ў Магілёве, на тэрыторыі, дзе зараз размяшчаецца завод «Строммашына». Некалькі разоў ён збягаў з лагера, але яго лавілі, збівалі, цкавалі сабакамі і вярталі ў засценкі.

У студзені 1943 года група ваеннапалонных падрыхтавала чарговыя ўцёкі. Адзін з палонных салдат быў слесарам, ён здолеў падабраць і падтачыць ключы ад брамкі задняга двара, куды выходзілі нямецкія афіцэры. Ноччу ў 30-градусны мароз ім удалося збегчы. Ніхто з групы не ўяўляў, куды ісці. Зразумела было адно: любой цаной дабрацца да сваіх.

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны, баец 277-га партызанскага палка М. Р. Сахрай.

Але лінія фронту была за сотні кіламетраў. Яшчэ знаходзячыся ў лагеры, палонныя чулі, што ва Усакінскіх лясах (а гэта кіламетры лясоў і непраходных балот) змагаюцца з ворагам партызаны.

Група вырашыла рухацца ў напрамку вёскі Усакіна Клічаўскага раёна. Стаялі маразы з моцным пранізлівым ветрам. Вопратка знасілася, парвалася, каб крыху сагрэцца, стараліся як мага больш ісці. Вогнішча нельга было разводзіць, каб не прыцягнуць увагу немцаў. Начамі заходзілі ў невялікія вёскі, прасілі паесці, даць якую-небудзь вопратку. Паступова невялікая група пачала радзець. Некаторых чырвонаармейцаў жыхары глухіх вёсак пакідалі ў сябе, паілі, кармілі, лячылі. Бацьку ніхто не браў і надзеі, што яго прытуляць, не было. Хутка ён застаўся адзін, ішоў і не ведаў куды, прымушаў сябе рухацца, каб не замерзнуць канчаткова. Бацька разумеў, што пагражае таму, хто яго схавае. Таму нават не прасіў дапамогі. З-за таго, што ён нарадзіўся ў яўрэйскім мястэчку і вучыўся ў яўрэйскай школе, пры размове ў яго захоўваўся акцэнт. Ды і знешнасць немагчыма было схаваць. У вёсках паўсюль віселі нямецкія ўлёткі, у якіх гаварылася, што той, хто выдасць нямецкім уладам яўрэя, атрымае прэмію — пачак махоркі. Вяскоўцы баяліся, што за дапамогу яўрэю іх могуць знішчыць, і не хацелі пускаць у хату. У лепшым выпадку давалі крыху хлеба і гаварылі: «Ідзі адсюль хутчэй!»

«Ён не армянін, а жыд!»

Сіл ісці ў яго ўжо не было. Вопратка парвалася і вісела лахманамі, брызентавыя боты развальваліся, з дзірак тырчэлі кавалкі ануч, наматаныя на голыя ступні. Ногі ўжо не адчуваў, а рукі віселі, як плеці. Страшэнна хацелася спаць. Паўсюль намяло гурбаў, і ісці станавілася ўсё цяжэй. Раптам ён заўважыў вёску. Без вады, ежы, хворы, з адмарожанымі канечнасцямі, бацька адчуваў: калі яго тут не прытуляць, далей ісці ён проста не здолее...

(Праз гады, калі ў 1961 годзе, 15-гадовым падлеткам, з бацькам я пабываў упершыню ў гэтай вёсцы Закупленне, чуў ад месцічаў працяг гісторыі.)

На вуліцы бацьку заўважыў малады хлопец Іван і перадаў сваёй маці, што на бярвёнах сядзіць худы, абарваны чалавек: «Просіцца ў хату, уцёк з лагера. Кажа, што армянін, але я бачу, што па размове ён не армянін, а жыд». Маці тады адказала сыну: «Хто б ён ні быў, ён — чалавек! Вядзі ў хату!»

Так мой тата аказаўся ў сям'і Івана Пятровіча Сіліна. У гаспадыні Крысціны, акрамя сына, былі яшчэ дзве малодшыя дачкі — Вольга і Настасся. Жанчына дала наказ дзецям: «Многа яму есці не давайце. Ён даўно нічога не еў і можа памерці». Бацьку пакрысе адпойвалі малаком і хавалі на печы за фіранкай.

Боты з ног зняць не змаглі. Ногі апухлі, а скура быццам прырасла да халяў. Гаспадыня разам з Іванам маленькімі кавалкамі зразала нажом брызент разам са скурай, залечвала раны на нагах. І яшчэ папярэдзіла: «Ты — глуханямы. Нічога не чуеш, не ведаеш, гаварыць не можаш. Загаворыш — загінеш і ты, і ўся наша сям'я. Зойдуць немцы — ляжы на печы і не шавяліся». Гэта беларуская жанчына, як толькі немцы ці паліцаі заходзілі ў хату, клалася побач з бацькам на край печы, закрывала яго сваім целам, ратуючы ад вернай гібелі.

Паступова бацька стаў папраўляцца і адразу хацеў ісці да партызанаў, але гаспадыня казала, што яму яшчэ трэба паздаравець. Вяскоўцы ведалі, што Сіліны хаваюць яўрэя, у вёсцы за маім бацькам нават замацавалася мянушка «Чыжык»... Ведаў пра яго ў тым ліку і староста Сямён Жалязнякоў. Апошні нават папярэджваў усіх, каб маўчалі. Расказвалі, што ў тыя гады ён быў звязаны з партызанамі...

Пазней бацька патрапіў у партызанскі атрад № 277 пад камандаваннем Ігната Ізоха. Спачатку яго накіравалі ў гаспадарчы ўзвод, на баявыя заданні не пускалі. Ставіліся насцярожана. Увесь гэты час яго правяралі. Падазрэнне выклікала тое, што яўрэй, які знаходзіўся ў фашысцкіх засценках, змог такі доўгі час застацца жывым.

Аднойчы па гаспадарчых справах бацька зайшоў да камандзіра атрада Ізоха. Той толькі пачаў галіцца і парэзаўся. Відаць, у яго не было навыкаў карыстання небяспечнай брытвай. Калі бацька ўбачыў гэта, не вытрымаў і прапанаваў пагаліць і пастрыгчы. Ізох запытаўся: «Ты што, цырульнік?» і пасля станоўчага адказу бацькі пачаў распытваць, адкуль ён. Аказалася, што Ігнат Зіноўевіч некалькі разоў заходзіў у цырульню ў Магілёве, дзе працаваў бацька. Камандзір тады падарыў яму машынку для стрыжкі валасоў, нажніцы і некалькі брытваў, якія захаваліся ў нашай сям'і да гэтага часу. Пасля чаго праверкі скончыліся, і бацьку сталі пасылаць у разведку і на баявыя заданні...



Мемарыял загінулым партызанам ва Усакінскім лесе.

Прыязджалі ўсёй вёскай

У дзяцінстве ў нас дома я часта сустракаўся з былымі партызанамі злучэння № 277, чуў прозвішчы і імёны — Заяц, Вікторчык, Піменаў, Букаты, Львоўскі, Каконцаў і іншыя.

Знаходзячыся ў атрадзе, бацька ніколі не забываў тых, хто выратаваў яму жыццё. Пачуе, што на вёску ідуць карнікі, ускоквае на каня — і да Івана: папярэдзіць, каб той адводзіў людзей і скаціну ў лес. Вёску Закупленне немцы некалькі разоў падпальвалі, рабавалі, забівалі людзей.

28 чэрвеня 1944 года быў вызвалены Магілёў. Большасць байцоў 277-га партызанскага палка разам з байцамі Чырвонай Арміі пайшлі на захад. А бацьку разам з некалькімі партызанамі пакінулі ў Магілёве для навядзення парадку і аднаўлення гаспадаркі.

Скончылася вайна. Бацька працаваў у цырульні магілёўскага чыгуначнага вакзала. І вось аднойчы на яе парозе з'яўляецца... Іван Пятровіч Сілін. Бацька ад нечаканасці нават застыў з брытвай у руках. Абняліся, як браты. У нас дома Іван Пятровіч дастаў з мяшка беларускі ручнік: «Маці, калі памірала, зняла яго з іконы і сказала: «Знойдзеш Сахрая, аддай Моціку гэты ручнік, і няхай ён ім выцірае-ца, каб Бог яго ахоўваў»...

Доўгі час наша сям'я падтрымлівала шчыльныя зносіны з сям'ёй Сіліных. Уся вёска адразу пасля вайны прыязджала да нас у Магілёў. Час быў цяжкі, галодны. Не хапала хлеба, вопраткі. Краіна ўзнімалася з руін. Вёска жыла натуральнай гаспадаркай. Таму любую дапамогу з горада сяляне прымалі з удзячнасцю. Бацька і маці дапамагалі ім, чым маглі, хоць самі жылі ў пастаяннай нястачы. Але як толькі на парозе з'яўляліся жыхары вёскі, дастаткова ім было сказаць, што яны з Закупленя, бацькі прымалі іх як родных. У двухпакаёвай кватэры на вуліцы Ленінскай у Магілёве, дзе мы ў той час жылі, усім для начлегу не заўсёды хапала месца. Але неяк уладкоўваліся, клаліся, дзе давядзецца, — на рускай печы, на ляжанцы, на лаўках, на падлозе. Маці як магла дапамагала, аддавала вопратку і мэблю. У той час у вёсках нават ложкаў не было, спалі на палацях. Праз гады да нас прыязджалі ўжо дзеці вяскоўцаў, якія ведалі пра нашы адносіны з расповедаў сваіх бацькоў...

* * *

У 1990 годзе наша сям'я пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў Ізраіль, дзе такім людзям, як сям'я Сіліных і жыхары вёскі Закупленне, якія ратавалі яўрэяў у гады Вялікай Айчыннай вайны, даюць званне «Праведнікі народаў свету». У жніўні 2014 года я прыехаў з Ізраіля ў тую самую вёску Закупленне з надзеяй знайсці хоць каго-небудзь, хто быў сведкам тых даўніх падзей. Калі я пачаў распытваць мясцовых жыхароў, ці ведаюць яны гісторыю пра тое, як вёска ратавала ў гады вайны яўрэяў, што збег з лагера ваеннапалонных, мясцовы жыхар, які нарадзіўся пасля вайны, расказаў мне ўсё, што ведаў пра майго бацьку. А калі я яму сказаў, што я сын таго Моціка Сахрая, абдымкам і гасціннасці не было канца... У гэтай вёсцы і цяпер жывуць добрыя і спагадлівыя людзі. Праз пакаленні перадаецца гісторыя ратавання і падзей тых гадоў. Сустракаўся я і з сынам старасты вёскі Сямёна Жалязнякова. Сустрэў нявестку Івана Пятровіча Сіліна, з якім мы доўгі час сябравалі. І мяне прымалі як роднага і блізкага чалавека. Гэтак жа, як тады, у 1943 годзе майго бацьку.

Мы, нашчадкі тых, хто перажыў цяжкія гады вайны і са зброяй у руках абараняў Беларусь, не забудзем людзей з адкрытымі добрымі сэрцамі, якія ў цяжкі час працягнулі руку дапамогі і, рызыкуючы сабой, збераглі чалавечыя жыцці.

Генадзь САХРАЙ.

Хата, у якой сям'я Сіліных хавала Моціка Сахрая пасля ўцёкаў з лагера ваеннапалонных. Вёска Закупленне.

КУЛЬКА МАЛЕНЬКАЯ, А МЯДЗВЕДЗЯ ВАЛІЦЬ

...Некалі даўным-даўно, пасля Перамогі, тыя, хто ацалеў на вайне, сталі вяртацца дамоў — з раненнямі, узнагародамі, гасцінцамі... Апанас прыехаў са старым патэфонам. Добрая рэч, але ж чацвярым ягоным дзецям (адзін аднаго, можна сказаць, не падымалі яшчэ) было тады зусім не да музыкі: галодныя, босыя, гаспадаркі ніякай... Немцы ўсё пазабіралі, нават курэй.

Так што прыйшлося Апанасу прадаць патэфон, за тыя грошы купіць свінчо, неяк падкарміць-падгадаваць яго, каб урэшце ўсё сала-мяса адвезці на базарды прыцаніцца там да рагуль.

...У горад ён дабраўся загадзя, на рынку прайшоўся па гандлёвых радах — паглядзеў, што пачым прадаюць, што купляюць.

На свой тавар цану завышаць не стаў — нават крышку занізіў... І не прагадаў: каля яго прылаўка адразу ж утварылася чарга: мяса з салам хутка расхапалі.

Факт, што праз нейкую гадзіну Апанас палічыў сваю выручку, схаваў яе ў патайную кішэнь і рушыў глядзець кароў.

Прадавалася іх зусім няшмат, і толькі адна спадабалася.

— Колькі просіш за гэтую прыгажуню? — спытаў гаспадара.

— Семсот рублёў. Будзеш браць, крыху саступлю.

Грошай у Апанаса, вядома ж, не хапала, але вакол рагулі ён патупаў: паглядзеў на рогі, прыклаў пальцы паміж рабрын, пацікавіўся, колькі дае малака.

— Літраў 10-12, — сказаў прадавец, бачачы, што Апанаса не дужа падманеш. — Затое тлустасць амаль шэсць працэнтаў.

— А ў мяне дома шэсць едакоў. Ды яшчэ і цешча з цесцем. Так што нам колькасць патрэбная.

На тым мужыкі і разышліся. Апанас ужо з базару кіраваў — без каровы, калі пачуў:

— Браток, купі ў мяне парсючка... Танна аддам. Апошні ў клетцы.

Апанас зірнуў туды — пуста...

— Змёрз, відаць, і ў салому зашыўся. Зараз дастану чарцяку, — паабяцаў прадавец і сапраўды выцягнуў за ножкі нешта худое, нягеглае.

— Цьфу ты! — сплюнуў Апанас. — Парася знайшоў... Яно ж нават не пішчыць!

— Тады без грошай вазьмі, — папрасіў прадавец. — Часу няма стаяць тут — дадому трэба...

Спяшаўся туды і Апанас — з тым самым «чарцякам» (як не ўзяць, калі дарма даюць?)...

— Ну і навошта? — з парога стала сварыцца жонка. — Што з ім зараз рабіць? Ды без малака... Яно ж да вечара ці дажыве?

...Паваждацца з малым сапраўды прыйшлося. Затое потым, калі трохі падрасло, — аніякіх праблем: парсючок добра еў, хутка рос, гуляў з дзецьмі (а дзеці — з ім)... Факт, што закалоўшы, сала мералі ледзь не пяцідзяй! А потым, прадаўшы яго, Апанас купіў сабе добрую карову.

Значыць, у народзе праўду кажуць, што кулька маленькая, а мядзведзя валіць.

Так, дарэчы, і з людзьмі: хлопец з выгляду бывае аніякі, а мужам будзе, якіх пашукаць: добры, гаспадарлівы...

Хоць часцей, відаць, якраз наадварот.

Мікалай Багданаў,
Мёрскі раён.

СЮРПРЫЗ ДЛЯ КАХАНАЙ

...Што дораць мужчыны — жанчынам? Правільна: кветкі, футры, залатыя пярсцёнкі, французскую парфуму... Што атрымліваюць у адказ, таксама не сакрэт: сарочкі, шкарпэткі, пену для галення...

І мужчынам таго дастаткова, бо яны і так у цане. Іншая справа жанчыны. Ім каб падабацца, патрэбен настрой, а для яго стварэння...

Вось тут, на жаль, не дагадзіць. Нават чалавеку з вопытам.

Мой прыяцель, напрыклад — муж з вялікім стажам і проста рэдкі гаспадар: любіць, каб у хаце (гэта па-першае) парадак быў, каб кожная рэч для нечага служыла і на месцы ляжала. Каб, па-другое, у садзе-гародзе ўсё расло ды каласілася: Віктар Іванавіч для гэтага пастаянна там нешта капае, садзіць, прывівае ды паліваe... Кажа, што ў радасць яму сам працэс. А калі нешта яшчэ і вырасце — тады наогул свята... Ён жах як любіць ураджаі збіраць!..

І жонцы сваёй падарункі рабіць — таксама. Часам, праўда, вельмі нечаканыя... Для яе.

У той год, перад юбілеем, стаў з дому знікаць, па крамах хадзіць (куды ў іншы час, Таццяна казала, яго сілком не зацягнеш)... Потым, па вечарах, як бы між іншым расказваць, што цікавага бачыў у продажы і пачым...

Як яна зразумела, разведку праводзіў, перш чым сюрпрыз зрабіць. Затое потым, перад юбілеем, дадому птушкай ляцеў! І пад «крылом» нешта нёс яшчэ.

— Можа, у латарэю выйграў? — з парога спытала жонка. — То расказвай, што?

— Пачакай крыху. Заўтра, — паабяцаў ёй муж, — і раскажу, і пакажу...

І сапраўды — Таня чула — устаў рана-раненька, у кухню падаўся: дзверы за сабой няшчыльна зачыніў, так што жонка ўбачыла нейкія... водбліскі там — не тое салют, не тое феерверк. Святло, карацей...

Яно ды ў дзень юбілею, вядома ж, вабіла, інтрыгавала... Таму жонка, трохі прыбраўшыся, таксама рушыла ў кухню.

Іванавіч не здзівіўся, бо, вядома ж, чакаў: прытуліў імяніннiцу да грудзей, сказаў сваё «віншую!», потым па даўняй завядзёнцы папрасіў адвярнуцца да сцяны і заплюшчыць вочы. Таня так і зрабіла, але ж «мозгам спінным адчула», як у мужавых руках шамаціць нейкі пакет, як апускаецца на стол цяжкаваты пакунак, як...

— Ну вось... Можаш паглядзець! — нарэшце дазволіў гаспадар.

Таня павярнулася, раскрыла вочы, а знячэўку яшчэ і... рот, бо яе муж трымаў у руках вялізны... ліхтар.

— Табе што — не падабаецца? — спытаў у жонкі, не пачуўшы ніякай рэакцыі.

— Ну чаму раптам не? — усміхнулася тая. — Цікава... Толькі што мне з гэтым рабіць?

— Як што?! Ну хоць бы і на стол паставіць — гарбаты папіць, газету пачытаць... Ты ж паглядзі, як свеціць!.. Чыста пражэктар на маяку! Як там у песні: «Видно, хоч голки збирай»! А калі электрычнасць адключыцца...

— Дык яна ж як быццам даўно не адключалася? — паспрабавала ўспомніць юбілярка.

— Ну як жа? Некалі было... Помніш — вясной... Хвілін на 20. І будзе! Вось убачыш!

— З такім ліхтаром — дакладна! — засмяялася Таня.

«Не ацаніла», — заўважыў муж і, цяжанька ўздыхнуўшы, падаўся на балкон. Там стаялі з вечара прыхаваныя кветкі і каробка жончыных любімых цукерак.

— Вось за гэта — дзякуй! — узрадавалася Таня і ўключыла чайнік.

Іванавіч стаў тупаць побач — дапамагаць і па-ранейшаму думаць: «Ну праўда, што гэтым жанчынам трэба? Такая рэч, такі шыкоўны ліхтар, можна сказаць, пражэктар, ёй — бач — не падарунак, а нейкі «венік» на тры дні (ну хай сабе з кветак) — і ўжо шчаслівая...

Адно слова: жанчыны — загадка для мужчын.

...Дарэчы, пра яе, менавіта вось гэтую, я паспрабавала адной кабеце расказаць: маўляў, маёй знаёмай у дзень нараджэння муж такі нечаканы падарунак зрабіў — ліхтар... Жанчына ў адказ: «Во бедная! І як ёй з ім на вуліцу выйсці?» — «А навошта выходзіць?» — не зразумела я. — Хай дома стаіць». — «Дык ён што — не пад вокам?»

Усё, можна смяяцца.

Соф'я Кусянкова,
в. Лучын,
Рагачоўскі раён.

ГОГА, ЁН ЖА ГОША... А ДЗЯДОЎНІК — ЁН ЖА БАДЗЯК

Цяпер шмат хто працуе на так званай аддаленцы, што і зразумела... Прычым справа не толькі ў каранавірусе. У нас, напрыклад, ёсць знаёмыя праграмісты, якія на зіму штогод з'язджаюць туды, дзе цяплей. Завядзёнка ў іх такая. Ну чаму б і не, калі грошы ёсць, мовы замежныя ведаюць, а працаваць ім усё роўна адкуль — абы інтэрнэт «цягнуў».

Дык вось. Неяк двое сяброў (назавём іх Віктар і Уладзя) у чарговы раз з'ехалі. Агледзеліся там, уладкаваліся, жывуць, але неяк сумнавата, бо класік, як высвятляецца, праўду пісаў, што «за светам, на чужыне ніхто цябе, ой, не прыхіне!» А яно ж такі хочацца, каб прыхінуў...

Для гэтага хлопцы вырашылі запрасіць на канікулы дзяўчат: сястру Віктара Алёну і яе сяброўку Наташу.

Тыя, вядома ж, з ахвотай сабраліся, гадзіны за тры даляцелі (білеты ім замовілі хлопцы). І вось яна, сустрэча: радасць, абдымкі... На таксі да кватэры, а там, глядзіш, ужо і стол накрыты.

Карацей, усё было б добра, калі б Наташу трохі не падвёў страўнік. Яму, падобна, пералёт не спадабаўся, а мо і нязвыклае пітво ці ежа? Але ж рэзаць стаў... Ды так, што дзеўцы і свет не мілы.

Прызнавацца ў гэтым — сябрам настрой псаваць — Наташы не хацелася, — ціхенька ўстала з-за стала і адна, у чужым бязлюдным пасёлку, падалася шукаць аптэку.

Шыльду з зялёным крыжам убачыла здалёк — зайшла ў аптэку. Але ж пігулкі там купляць не збіралася: бо змалку не прызнавала: бабуля яе травамі лячыла. Ад нястраўнасці, напрыклад, дзядоўнік дапамагаў. Значыць яго і трэба спытаць?

— Мне б, калі ласка, — ціхенька, ветліва пачала дзяўчына і змоўкла, бо не ведала, як па-англійску «дзядоўнік». Па-руску дадала — *растопшу*.

Аптэкарка не зразумела.

— У вас такая трава не расце? — спытала дзяўчына. — Ці, можа, інакш называецца?

Аптэкарка паклікала сваю каляжанку, аднак што такое *расторопша* (яна ж дзядоўнік, яна ж бадзяк...) не ведала і тая.

Прыйшлося распачаць сеанс пантамімы. Падчас яго Наташа пагудзела і рукой паказала, як гайдаўся-ляцеў яе самалёт, потым сказала, што ў ім ела і што піла, а нарэшце паклала рукі на жывот і скрывілася ад болю.

Вось тут аптэкаркі ўжо зразумелі, у чым праблема, і Наташы засталося хіба расказаць-паказаць, якім чынам яе вырашыць.

Для гэтага яна выцягнулася ў струнку (як сцяблінка таго дзядоўніка), задрала рукі ўверх, веерам расклала пальцы (яны ж калючкі), паляпала сябе па галаве, «малюючы» там кветку такога ж колеру, як яе безрукаўка, і гучна, па складах прамовіла сваё: *«Рас-то-роп-ша...»*

Якраз яе, гэтую «расліну», ва ўсёй прыгажосці і ўбачылі Наташыны сябры, якія, вядома ж, заўважылі, што апошняй даўгавата няма за сталом, і ўсе разам прыбеглі ў аптэку (Алёна сказала, што сяброўцы яшчэ ў дарозе было нядобра)...

Факт, што яны паспелі пабачыць Наташыну пантаміму, патлумачыць усё правізарам, разам з імі ад душы пасмяяцца, а потым, купіўшы патрэбных лекаў, усёй кампаніяй рушыць дамоў, каб лячыць Наташу і — без варыянтаў — вучыць замежныя мовы.

Любоў Міхальчык,
г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж ЗАЎСЁДНАЕ: «Пішыце!»

Неасабісты суб'ектыў

Дом Мовы

Прычыны аптымізму для класіка і сучаснікаў

ПАМЯТАЮ, на падрыхтоўцы да школьных алімпіяд па беларускай мове адно з заданняў было — прыгадаць цытаты пісьменнікаў, ёй самой, мове, прысвечаныя. У тым спісе былі бадай што ўсе вядомыя літаратары: Купала, Танк, Панчанка, Броўка, Караткевіч, Гілевіч, Барадулін... Вершы — прыгожыя, прачулыя, светлыя. Але ў большасці сваёй не вельмі аптымістычныя. «Родная мова, хоць бедная мова, // Мілей найбагатшай чужой...», «А задумае вораг з далёкага краю // Адабраць у мяне, знішчыць мову маю...», «Пакіньце мне мову маю. // Пакіньце жыццё мне...», «Без цябе, не з табой не патрэбен мне рай...», «Мне, як бору, цябе засланяць...», «Ізноў зазвініш ты ў кожнай у хаце...», «Не пакідайце ж...» Карацей, не хачу пакрыўдзіць класікаў і сучаснікаў, але ж суцэльныя прызнанні, клятвы, апраўданні — нібы не толькі чытачоў, але і самі сябе аўтары пераконваюць, што мова, на якой яны думаюць, на якой талент дыктуе ім рыфмаваныя радкі, мае права на існаванне, што яна не горшая за іншыя. Гэткі своеасаблівы феномен нашай літаратуры, бо складана ўявіць, як Гётэ праслаўляе ў вершы нямецкую, а, напрыклад, Лорка — іспанскую...

І сярод гэтых «песень жальбы» — бы свежы вецер у твар: «Слова — радасць, слова — чары, // Вобраз вечна юных вёсен, // Ёсць ты ўсюды: у сонца, у хмары, // Ты глядзіш праз неба просінь. // Лашчыш слух мой, словазвяне, // Атуляеш сэрца ласкай, // Ноч і вечар, дзень, світанне, // Абняло ты, слова-краска». Магу памыляцца, але ў Якуба Коласа, здаецца, больш вершаў пра мову і няма. Чаму ж раптам Канстанцін Міхайлавіч аказаўся такім аптымістам?

ПАЕЗДЗІЎШЫ ўчора па радзіме паэта, я, здаецца, нарэшце зразумела, чаму. Таму што мова ў гэтым куточку нашай краіны, у самым яе сэрцы — частка існавання мясцовых жыхароў. Таму што менавіта там яе Дом, яна там жыве, яна і сёння там — паўнавартасная гаспадыня.

У гэтым пашчасціла пераканацца на кожным кроку. Пачынаючы з тэлефоннай размовы з чыноўнікам райвыканкама, які пачынаў па-руску, а праз колькі хвілін ужо жартаваў: «Вам патрэбен навігатар на стаўпецкай мове...» Навігатар сапраўды спатрэбіўся — на пакручастых стаўбцоўскіх вуліцах крыху заблукалі, давялося пытацца дарогу ў мясцовых дзядзькоў. І яны, перабіваючы адзін аднаго, на чысцюткай беларускай пачалі тлумачыць, як нам выехаць да цэнтра. А мы нібы не разумелі і нешта ўдакладнялі, каб яшчэ раз пачуць яе — сакавітую, мяккую — нібы па сэрцы хтосьці пяшчотна пагладзіў.

Яна гучала ў нашым падарожжы паўсюдна і цэлы дзень. Куды б ні ехалі, з кім бы ні размаўлялі. Нязмушаная, чыстая — так бывае, калі людзі на мове думаюць (а гэта значыць, калі яна сапраўды родная). У Акінчыцах, дзе нарадзіўся Колас, — не толькі з вуснаў праўнучкі паэта — на ёй гаварыла і мясцовая кабета, якая зграбала каля музейнай сядзібы лісце. У Альбуці — ад музейнага наглядчыка Анатоля Іванавіча, які сціпла паўтараў: «Я ж не экскурсавод», а сам сыпаў жартамі, паказваў засушаныя гаючыя травы: «Вось гэта святаяннік, гэта мацярдушка, гэта палын». Хораша было з ім пагаварыць і пра хатні рыштунак, паспрачацца пра тое, што музейны кубелец вельмі падобны на цэбар. Маладзейшыя калегі здзіўлена слухалі наш дыялог, але затое даведаліся, што на цэбры — металічныя абручы, а на кубельцы абавязкова павінны быць драўляныя, каб на сала, якое ў ім соляць, не трапіла ржа. У Смольні ад кагосьці давялося пачуць смачнае слоўца — «равэрак», на якім Янка Маўр прыехаў да Коласа на нелегальны настаўніцкі з'езд і які стаў прычынай раскрыцця гэтага мерапрыемства. (Чаму — абавязкова раскажу ў іншай публікацыі, якая будзе вельмі хутка.)

МОВА гучала і ў вясковых школах, у якія давялося заехаць, — у Мікалаеўшчыне, у Дзераўной. Яны беларускамоўныя не толькі на паперы — на мове гавораць і вучні, і настаўнікі, і не толькі на ўроках. Хутчэй яны здзіўляліся, калі чулі, што мы, прыязджыя са сталіцы, гаворым з імі на адной мове, дзякавалі, шчыра радаваліся. У школах хваліліся поспехамі сваіх вучняў, якія займаюць прызавыя месцы на рэспубліканскіх конкурсах, паступаюць у ВНУ. Ні разу, ні ад кога не давялося пачуць, што мова дзесьці перашкодзіла, хутчэй — дапамагла...

У Вішняўцы Ганна Іванаўна, якая жыве насупраць мясцовай царквы і паказвала нам храм па просьбе бацюшкі, бо ён быў у ад'ездзе, нават толкам не ведаючы, хто мы, таксама гаварыла на мове нязмушана і чыста. На маё захапленне адказала проста: «Усё жыццё так гаварылі, навошта ж перавучвацца?» І — у працяг тэмы — тут жа з гонарам расказала пра свайго сына, які жыве ў Маскве («Цэлы палкоўнік!»), але, прыязджаючы ў родную вёску, тут жа пераключаецца на родную мову («Хаця ён жа ў мяне, дзіцятка, ведае і нямецкую, і англійскую, не кажучы ўжо пра рускую»)...

ТУТ людзі гаварыць на мове проста і не задумваючыся — як дыхаюць. Так ёсць цяпер, так было ў часы паэта, які роднаму слову прысвяціў сонечны бадзёры верш. Ён натхніў на гэта наступныя пакаленні землякоў, ці ў гэтага куточка ў цэнтры краіны ёсць нейкая адмысловая аўра? На гэта пакуль няма адказу. Але ёсць калі не ўпэўненасць, дык спадзяванне, што гэта месца не адзінае ў Беларусі.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 30 ноября 2020 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе				
№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Сведения о земельном участке	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
